Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 ЛЮТАГА 2017 г. ПЯТНІЦА № 23 (28387)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Уласны брэнд у 22 гады

СТАР. 4



«Дзіцячаму доктару» споўніўся год

СТАР. 5



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

# Хоцімскі віртуоз



Уладзіміра КОРНЕВА называюць віртуозам ігры на гармоніку. Музыкант жыве ў Хоцімскім раёне, але яго ведаюць далёка за межамі Магілёўшчыны. Маючы абсалютны слых і бездакорнае адчуванне рытму, Уладзімір Захаравіч яшчэ ў маленстве авалодаў «двухрадкай», іграў на вяселлях і провадах у армію, узнімаў настрой саслужыўцам, калі сам праходзіў воінскую службу. Цяпер гэты адораны жыхар вёскі Трасціно рамантуе старыя інструменты, таму ў яго хаце так шмат гармонікаў — тульскіх, нямецкіх, і, само сабою, беларускіх.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Максім ЕРМАЛОВІЧ, першы намеснік міністра фінансаў:**

*«Што датычыцца бюджэтнай палітыкі краіны, то падыходы, закладзеныя ў бюджэт 2017 года, дастаткова кансерватыўныя і прадугледжваюць меры па бюджэтнай кансалідацыі, бюджэт сфарміраваны з прафіцытам. Як вядома, Беларусь імкнецца да таго, каб пачаць новую праграму супрацоўніцтва з Міжнародным валютным фондам у першай палове 2017 года».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.02.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9344 | ▼ |
| Еўра | 2,0875 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0322 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0715 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Актуальна

## СКАРЫНА КРОЧЫЦЬ ПА ПЛАНЕЦЕ

500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню

### Першадрукар — наш пасол ва ўсім свеце



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Прадстаўляць Беларусь можна па-рознаму: праз адметныя вырабы, тавары, праз мастацтва, але найлепш пра краіну расказваюць людзі. Думаецца, асоба Францыска Скарыны — Чалавека Свету, які зрабіў вялікі ўнёсак у развіццё еўрапейскай культуры, аб'яднаў сваёй працай многія гарады і краіны, — і сёння з'яўляецца найлепшым дыпламатам. Таму невыпадкова ў плане святкавання 500-годдзя беларускага кнігавыдання, якое мы шырока адзначаем сёлета, так многа міжнародных праектаў. Пра Скарыну будуць расказваць нашы суайчыннікі, праводзячы Дні беларускай культуры ў розных краінах. На яго ж звернуць увагу госці іншых дзяржаў, якія завітаюць да нас на канферэнцыі, выстаўкі, сімпозіумы.**

СТАР. 3

■ Гендар

## Жанчыны з дзецьмі — нязручныя работнікі?

Беларусы сутыкаюцца з дыскрымінацыяй на рынку працы, але ў суд не звяртаюцца

**«На чарговым сходзе кіраўнік сказаў нам, што на працоўным месцы паміраць не трэба: хварэеце — ідзіце на «бальнічны». А калі дзеці хварэюць, то вы можаце сабе дазволіць няньку. Калі пойдзеце на дзіцячы «бальнічны» тры разы за год, з вамі не працягнуць кантракт». Гэта адна з гісторый, сабраных падчас інфармацыйнай кампаніі «Пол не столь», якая вывучала пытанні няроўнасці па прыкмеце полу на рынку працы.**

### «СЫХОДЗІЎ У ДЭКРЭТ — З МЯНЕ ПАСМЯЯЛІСЯ»

Міжнародная грамадская арганізацыя «Гендарныя перспектывы» запусціла кампанію ў жніўні мінулага года. За гэты час было даслана каля паўсотні гісторый аб дыскрымінацыі. Большасць з іх (90 працэнтаў) паступіла ад жанчын. У кожнай шостай гісторыі дамы расказвалі, што яны атрымлівалі адмову ў прыёме на работу, бо на гэту пасаду наймальнік планаваў узяць мужчыну, які з'яўляецца больш выгадным супрацоўнікам (паколькі не сядзіць у дэкрэтным і не застаецца дома з хворымі дзецьмі). Жанчыны таксама часта пісалі, што на сумоўях ім задавалі пытанні аб сямейным становішчы: ці замужам, ці ёсць дзеці.

Як аказалася, мужчыны з сямейнымі абавязкамі таксама сутыкаюцца з праблемамі. «Мая начальніца смяялася, калі я паведаміў аб сыходзе ў дэкрэт, і падчас сацыяльнага водпуску пастаянна нагадвала мне пра тое, што мяне чакае работа», — падзяліўся гісторыяй адзін з бацькоў.

СТАР. 4

# ЧАС ДЗЕЙНІЧАЦЬ

## У гандлі паміж Беларуссю і Пакістанам ёсць рэальныя магчымасці для дасягнення ўзаемнага тавараабароту $1 млрд да 2020 года

**Упэўненасць у гэтым выказаў Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы са старшынёй Сената парламента Пакістана Міянам Раза Рабані.**

«Нам трэба сур'ёзна падумаць аб умацаванні нашых адносін», — заявіў кіраўнік дзяржавы, вітаючы пакістанскага госця.

Як паведаміў карэспандэнт БЕЛТА, Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на тым, што склаліся вельмі добрыя, дружалюбныя адносіны з кіраўніцтвам Пакістана — Прэзідэнтам, прэм'ер-міністрам. Размова ідзе аб тым, каб пашырыць узаемадзеянне па ўсіх напрамках.

«Нам, вядома ж, патрэбна ваша падтрымка. Ведаючы, якую ролю адыгрываюць парламенты ў дзвюх краінах, хачу папрасіць вас, каб вы ў Пакістане ўзялі на кантроль выкананне дарожнай карты, па якой мы дамовіліся дзейнічаць у бліжэйшай і сярэднетэрміновай перспектывах», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў, што паміж Беларуссю і Пакістанам ёсць дамоўленасць выбудаваць да 2020 года фундамент гандлёва-эканамічных адносін, дасягнуць $1 млрд у гандлі.

«Патэнцыял нашага супрацоўніцтва і рэальныя магчымасці для гэтага існуюць, — упэўнены Прэзідэнт. — Мы нават можам перасягнуць гэты паказчык. Нам трэба не проста рабіць заявы, але і імкнуцца да гэтага ўзроўню, абазначаючы не толькі канкрэтныя напрамкі супрацоўніцтва, але і аб'ёмы тавараў, якія мы можам узаемна пастаўляць на рынкі адзін аднаго».

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на той факт, што забароненых тэм ва ўзаемадзеянні паміж Беларуссю і Пакістанам няма. «Мы можам супрацоўнічаць па ўсіх напрамках, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — У нас сёння практычна няма рознагалоссяў. Але трэба пачынаць дзейнічаць, таму што час ідзе хутка, 2020 год не за гарамі».

Кіраўнік дзяржавы выказаў надзею, што дэпутаты парламентаў дзвюх краін, якія адказваюць за гэта супрацоўніцтва, будуць дзейнічаць больш актыўна.

# БАЧЫЦЬ УСЕ ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка прывёў да прысягі суддзю Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Віктара Рабцава, паведаміў карэспандэнт БЕЛТА.**

Пасля прынясення суддзёй прысягі Прэзідэнт уручыў Віктару Рабцаву пасведчанне суддзі Канстытуцыйнага суда і падарачны экзэмпляр Канстытуцыі Беларусі. На цырымоніі таксама прысутнічалі старшыні Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, Вярхоўнага і Канстытуцыйнага судоў.

«Хачу вас папрасіць, каб вы сапраўды былі надзейным вартавым выканання Асноўнага закона нашай краіны», — сказаў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы ў сувязі з гэтым адзначыў, што ад Беларусі часта патрабуюць увесці пасаду омбудсмена, які сачыў бы за захаваннем правоў чалавека. «У нас хоць і няма такой непасрэднай пасады, я заўсёды кажу: толькі тады будуць захоўвацца правы чалавека — права на дастойнае жыццё, на працу, адукацыю, ахову здароўя, атрыманне інфармацыі, свабоду СМІ, свабоду слова і гэтак далей (трэба бачыць усе правы чалавека), — калі галоўным інспектарам па захаванні правоў чалавека будзе Прэзідэнт», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў Віктару Рабцаву поспехаў на новай адказнай пасадзе. «Вы ў нас выдатны вучоны, практык. Думаю, што Канстытуцыйны суд у вашай асобе набудзе дастойнага эксперта і змагара за правы нашых людзей, вартавога выканання Канстытуцыі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт таксама адзначыў важнасць традыцыі публічнага прынясення прысягі суддзямі Канстытуцыйнага суда. «Самае галоўнае, гэта лішні раз нагадвае ўсім нам у краіне і за яе межамі аб дэмакратычнасці нашага дзяржаўнага ладу», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Як адзначыў Віктар Рабцаў у размове з журналістамі, прынясенне прысягі яшчэ раз падкрэслівае значнасць і ролю Канстытуцыйнага суда як асаблівага органа, прызначанага абараняць канстытуцыйны лад, правы і свабоды грамадзян, забяспечваць вяршэнства Канстытуцыі.

■ Парламенцкі дзённік

# ШЛЯХ ДА МІЛЬЯРДА

**Першы ў гісторыі двухбаковых адносін візіт у нашу краіну парламенцкай дэлегацыі Ісламскай Рэспублікі Пакістан распачаўся ўчора.**

Падчас сустрэчы са старшынёй Сената парламента Міянам Раза Рабані **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ** станоўча ацаніў праведзеную сумесную работу дзвюх краін. «Нам трэба выходзіць да 2020 года на аб'ём узаемнага гандлю ў адзін мільярд долараў у год. Гэта сапраўды складаная задача», — адзначыў ён. Адна з прапаноў для яе вырашэння — узаемнае прадстаўленне дзяржаўных прэферэнцый беларускім і пакістанскім кампаніям для стымуляцыі гандлёвай і інвестыцыйнай дзейнасці. Наступная — зніжэнне Пакістанам увазных мытных пошлін на грузавую і пасажырскую тэхніку.

Акрамя таго, беларускі бок зацікаўлены ва ўдзеле ў сумесных інфраструктурных праектах Пакістана і Кітая. Варта развіваць міжрэгіянальныя сувязі, пашыраць нарматыўна-прававую базу і паскараць прамысловую кааперацыю. А для гэтага, падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч, «мэтазгодна было б паскорыць ратыфікацыю пагаднення аб узаемнай абароне інвестыцый».

— У нас створаны ўсе неабходныя ўмовы для поўнафарматнага ўзаемадзеяння ва ўсіх сферах, якія ўяўляюць інтарэс і для Пакістана, і для Беларусі, — адзначыў у размове з пакістанскімі парламентарыямі **старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.** — Прэзідэнтам Беларусі і прэм'ер-міністрам Пакістана падпісаны дагавор аб дружбе і супрацоўніцтве. У гэтым дагаворы важнае месца адведзена і міжпарламенцкім стасункам.

Уладзімір Андрэйчанка паведаміў, што ў рамках працягу міждзяржаўнага, міжпарламенцкага дыялогу ён плануе з 10 па 13 красавіка бягучага года здзейсніць візіт у Пакістан.

* * *

Падчас сустрэчы старшыні пакістанскага Сената і **прэм'ер-міністра нашай краіны Андрэя КАБЯКОВА** прагучала прапанова аб удзеле беларускага боку ў будаўніцтве аб'ектаў на тэрыторыі Пакістана. У сваю чаргу, адным з плюсаў супрацоўніцтва на тэрыторыі нашай краіны прэм'ер назваў тое, што Беларусь знаходзіцца на памежжы Еўрапейскага і Еўразійскага эканамічнага саюзаў, што робіць яе больш інвестыцыйна прывабнай.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*
**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Партнёры

# КАСТРАМСКІ ВЕКТАР

## Падведзены вынікі супрацоўніцтва Беларусі з гэтым рэгіёнам за мінулы год

**Ювелірная сталіца Расіі, калыска Дома Раманавых і радзіма вядомай маркі сыру, Кастрама — горад у цэнтральнай частцы Расіі — яшчэ і даволі перспектыўны беларускі партнёр. Нядаўна адбылося пасяджэнне беларускай часткі рабочай групы па супрацоўніцтве нашай дзяржавы і Кастрамской вобласці пад старшынствам міністра інфармацыі Лiліі АНАНІЧ.**

Чакалася, што па выніках 2016 года рост экспарту тавараў у параўнанні з 2015-м складзе 104%. Згодна з данымі за студзень — лістапад мінулага года адпаведныя тэмпы склалі 102,1%. Асноўныя экспарцёры ў рэгіён — «Белнафтахім», «Белдзяржхарчпрам», «Беллегпрам», Мінсельгасхарч і Міністэрства прамысловасці. Істотны ўнёсак у экспарт тавараў у рэгіён аказваюць арганізацыі бязведамаснай падначаленасці.

Ёсць, несумненна, і цэлы шэраг акалічнасцяў, якія патрабуюць выпраўлення. Менавіта гэта работа і павінна стаць галоўным кірункам у актывізацыі ўзаемавыгадных эканамічных адносін з Кастрамской вобласцю.

Як прыклад — сітуацыя з лекамі, медпрэпаратамі. Па словах **Анатоля ГРУШКОЎСКАГА, начальніка аддзела знешнеэканамічных сувязяў Міністэрства аховы здароўя,** пастаўкі лекаў у Расійскую Федэрацыю ажыццяўляюцца праз Маскву, паколькі менавіта ў цэнтры вырашаюцца пытанні закупак лекавых сродкаў, а таксама іх выпрабаванні. Калі б былі прамыя пастаўкі ў рэгіён, сітуацыя выглядала б інакш.

На наступным тыдні — 6—7 лютага — у сталіцы будзе працаваць дэлегацыя Кастрамской вобласці Расійскай Федэрацыі пад кіраўніцтвам яе губернатара Сяргея Сітнікава. Як паведамілі ў Міністэрстве інфармацыі, падчас высокіх сустрэч на высокім узроўні будуць абмеркаваны перспектывы развіцця ўзаемадзеяння нашай дзяржавы і Кастрамской вобласці, ключавыя стратэгічныя кірункі двухбаковага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Фінансавая палітыка

# Інфляцыю не «адпусцяць» далей 9%

**Нацыянальны банк сёлета захавае ўзважаную грашова-крэдытную палітыку, асноўнай мэтай якой з'яўляецца зніжэнне інфляцыі да адназначнай велічыні — не вышэй за 9%. У цэлым такая палітыка павінна спрыяць падтрыманню збалансаванасці ў эканоміцы, што створыць неабходныя перадумовы для выканання прагнозных макраэканамічных паказчыкаў, паведамляе прэс-служба фінансавага рэгулятара.**

### Гнуткае кіраванне

Сёлета кіраўніцтва банкаўскай сферы вырашыла прытрымлівацца нейтральнага характару грашова-крэдытнай палітыкі, бо ў выпадку яе змякчэння існуе рызыка росту інфляцыйных і дэвальвацыйных працэсаў. «З іншага боку, залішне жорсткія ўмовы ў фінансавым сектары будуць стрымліваць дзелавую ініцыятыву і не дазволяць у поўнай меры рэалізаваць патэнцыял росту эканомікі, у тым ліку даходаў насельніцтва», — адзначыў **намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Сяргей КАЛЕЧЫЦ** на пашыраным пасяджэнні праўлення Нацбанка, дзе разглядаліся вынікі рэалізацыі грашова-крэдытнай палітыкі і забеспячэнне фінансавай стабільнасці ў 2016 годзе і асноўныя задачы на 2017 год.

Было адзначана, што другі год запар выконваецца задача па ўзроўні інфляцыі. У асноўным дзякуючы кантролю за грашовай прапановай летась спажывецкія цэны выраслі на 10,6% супраць 12% годам раней. За мінулы год быў забяспечаны рост золатавалютных рэзерваў на фоне зніжэння валютных абавязацельстваў Нацыянальнага банка.

### Стаўку рэфінансавання плануюць знізіць да 14—16%

У паведамленні рэгулятара гаворыцца, што сёлета Нацбанк сумесна з урадам працягне рэалізоўваць сістэмныя меры па забеспячэнні фінансавай стабільнасці ў краіне. Менавіта ў рамках такіх ініцыятыў плануецца зніжаць праблемную запазычанасць банкаў, скарачаць дырэктыўнае крэдытаванне і ствараць умовы для паскарання развіцця нябанкаўскіх сегментаў фінансавага рынку.

Надалей эксперты Нацбанка робяць сапраўды смелыя прагнозы. На іх думку, пры далейшым зніжэнні інфляцыйных працэсаў і забеспячэнні стабільнасці плацежнага балансу стаўка рэфінансавання да канца года можа быць знізана да 14—16 працэнтаў гадавых. Для забеспячэння макраэканамічнай стабільнасці ў 2017 годзе Нацыянальным банкам сумесна з урадам будуць прыняты меры па далейшым павелічэнні золатавалютных рэзерваў краіны.

### Пераход да планавага росту цэн

А яшчэ сёлета Нацбанкам плануецца «актывізаваць» падрыхтоўчыя мерапрыемствы, якія накіраваны на фарміраванне ўмоў для пераходу ў сярэднетэрміновай перспектыве да рэжыму інфляцыйнага таргетавання, што прадугледжана Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады.

Удзельнікі пасяджэння таксама сышліся ў меркаванні, што прадпрыемствы і насельніцтва Беларусі пакуль захоўваюць досыць высокі ўзровень інфляцыйных і дэвальвацыйных чаканняў. Аднаўленне даверу да дзеянняў эканамічных улад магчыма толькі пры ўмове рэалізацыі ўзважанай і адказнай палітыкі, падмацаванай канкрэтнымі дзеяннямі і вынікамі.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Парашэнка мае намер правесці рэферэндум па ўступленні Украіны ў НАТА

**Прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка заявіў аб планах правесці рэферэндум па пытанні ўступлення краіны ў НАТА. Пра гэта ён паведаміў у інтэрв'ю германскай газеце Berliner Morgenpost.**

«Што я па-сапраўднаму цаню, дык гэта меркаванне ўкраінскага народа. Чатыры гады таму за ўваходжанне Украіны ў НАТА выступала 16% насельніцтва. Цяпер гэтая лічба складае 54%. Як прэзідэнт я звярнуся да меркавання майго народа і праведу рэферэндум па пытанні ўдзелу ў НАТА. І калі ўкраінцы за гэта прагаласуюць, я зраблю ўсё, каб дамагчыся членства ў атлантычным альянсе», — цытуе выданне словы Парашэнкі.

### СМІ: Макрон стаў найбольш верагодным пераможцам прэзідэнцкіх выбараў у Францыі



**Былы міністр эканомікі і незалежны кандыдат Эмануэль Макрон стаў найбольш верагодным пераможцам прэзідэнцкіх выбараў у Францыі. Пра гэта сведчаць вынікі апытання, праведзенага сацыялагічнай службай Elabe для газеты Les Echos.**

Паводле атрыманых звестак, толькі 19—20% французаў гатовы прагаласаваць за былога прэм'ер-міністра Франсуа Фіёна. Такім чынам, адзначае выданне, ён наўрад ці пройдзе ў другі тур выбараў.

Гэта дае магчымасць трапіць у другі тур Макрону, за якога гатовыя аддаць свае галасы да 23% выбаршчыкаў. За лідара Нацфронту Марын Ле Пен могуць прагаласаваць ад 26% да 27% французаў. Калі гэтыя два палітыкі сустрэнуцца ў другім туры, то былы міністр эканомікі зможа разлічваць на галасы 65% грамадзян.

### Француз выявіў 100 кг золата ў доме, які атрымаў па спадчыне

**Жыхар Нармандыі выявіў сто кілаграмаў золата, схаванага ў доме, які ён атрымаў у спадчыну пасля смерці сваяка, перадае партал Normandie Actu.**

Паведамляецца, што мужчына спачатку не выявіў цікавасці да спадчыны і выклікаў аўкцыяніста для ацэнкі і продажу маёмасці. Аднак пры разборцы і вывазе мэблі ў доме выявіліся шматлікія схованкі з каштоўным металам.

«Залатая ліхаманка» ў горадзе Эўрэ ў выніку прынесла спадчынніку два залатыя зліткі вагой па 12 кілаграмаў, сем кілаграмовых брускоў золата і больш за пяць тысяч залатых манет. Агульны кошт знаходкі — каля 3,5 мільёна еўра. Адзначаецца, што былы ўладальнік набываў золата законным спосабам на працягу 50—60 гадоў і захаваў адпаведныя сертыфікаты.

# СКАРЫНА КРОЧЫЦЬ ПА ПЛАНЕЦЕ


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Не забудуцца на першадрукара і самі беларусы. Да шырокага святкавання далучацца выдаўцы, мастакі, тэатралы, музейшчыкі. Так, падчас пасяджэння рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, што прайшло ў Нацыянальнай бібліятэцы, быў абмеркаваны план святочных мерапрыемстваў. Ужо сёння ён уключае каля шасці дзясяткаў пунктаў і закранае фактычна ўсе сферы грамадскага і культурнага жыцця краіны. Свята атрымала свой стылёвы лагатып, пра яго будуць нагадваць і адмыслова распрацаваныя плакаты, якія размесцяцца ў кнігарнях, кіёсках «Белсаюздруку», бібліятэках.

— Увесь мінулы год для выдаўцоў стаў перыядам плённай працы, каб тэма 500-годдзя беларускага кнігадрукавання яшчэ раз нагадала і самім беларусам, і ўсяму свету, як шмат было зроблена нашымі суайчыннікамі ў далёкім мінулым, каб сучасная Беларусь мацавалася гістарычнымі каранямі, — заўважыла сустаршыня рэспубліканскага аргкамітэта, **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ**. — Але гэта не толькі наша свята, гэта свята для ўсіх усходніх славян. Дзякуючы нашаму першадрукару шырокае кола людзей атрымала магчымасць чытаць біблейскія тэксты.

Міністр інфармацыі нагадала, што яшчэ летась падчас сімпозіума «Пісьменнік і час», што праходзіў у дні Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, тэма скарынаўскай спадчыны была адной з цэнтральных, яна застанецца ў ліку галоўных і сёлета. Знакавымі для нас з'яўляюцца і многія кніжныя праекты, ужо рэалізаваныя і тыя, якія яшчэ працягваюцца. Так, кніга «Францыск Скарына на мовах народаў свету», што пабачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда», пабывала на многіх кніжных выстаўках па ўсім свеце. З ёй пазнаёміліся ў парламенце Сербіі, Скарыну па-сербску чытаў і прэзідэнт гэтай краіны. Першадрукар разам з айчыннай кнігай будзе шырока крочыць па свеце і сёлета. Плануецца, што айчынныя выдаўцы прадставяць свае праекты ў Літве, Польшчы, Францыі, Вялікабрытаніі, Аб'яднаных Арабскіх Эміратах, Германіі, Расіі. Члены беларускіх дэлегацый будуць не толькі паказваць нашу кнігу, але і ўдзельнічаць у круглых сталах, навуковых канферэнцыях.

— Адзначэнне юбілею беларускага кнігадрукавання і ўшанаванне памяці першадрукара ўжо мае сваю гісторыю, — расказаў сустаршыня рэспубліканскага аргкамітэта, **міністр культуры Барыс СВЯТЛОЎ**. — Першае выданне, прысвечанае даследаванню спадчыны Скарыны, у 1925 годзе падрыхтаваў Інстытут беларускай культуры. У ліку іншых знакавых мерапрыемстваў сёлета ў верасні мы плануем правесці міжнародны кангрэс, прысвечаны 500-годдзю беларускага кнігадрукавання, зладзім і выставачны праект «Францыск Скарына і яго эпоха», які дапоўніць святкаванне 950-годдзя Мінска і далучыць сталіцу да тэмы беларускага пісьменства.

Таксама міністр культуры выказаў прапанову ў знак пашаны надаць імя Францыска Скарыны Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Вобраз першадрукара будзе ўвасоблены і на тэатральнай сцэне. Так, летась Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі сумесна з Нацыянальнай бібліятэкай і Беларусбанкам правёў конкурс п'ес, прысвечаных першадрукару. І яго плён ужо бачны сёлета. Пастаноўка аднаго з пераможцаў падрыхтавана ў Магілёўскім тэатры, рыхтуецца спектакль і ў тэатры беларускай драматургіі.

Думаецца, святкаванне 500-годдзя беларускага кнігадрукавання стане сапраўды агульнанародным. Гэта пацвярджаецца і шырынёй агляду тэмы ў айчынным друку.

— Юбілей кнігадрукавання — нагода шырока расказаць пра культуру, асветніцтва Беларусі, — заўважыў **намеснік міністра інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ**. — Гэтая тэма гучыць на старонках рэспубліканскіх і рэгіянальных газет, у электронных СМІ, на радыё і тэлебачанні. Важнае месца тут займаюць матэрыялы, звязаныя з прадстаўленнем скарынаўскіх адрасоў у свеце.

Скарынаўскі год распачынаецца, і да святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання змогуць далучыцца многія жыхары і госці краіны. Саюз пісьменнікаў Беларусі ўжо распачаў дзіцячы праект «У гасцях у Францыска Скарыны», хутка будзе аб'яўлены творчы конкурс «Скарынавай душой успешнае слова». Можна быць упэўненымі: нас чакае яшчэ многа сюрпрызаў і цікавінак.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
vesialuha@zviazda.by

■ Запрашальнік

# ПІСЬМЕННІКІ СВЕТУ СУСТРЭНУЦЦА Ў МІНСКУ

**Ганаровы госць кніжнага кірмашу — Злучанае Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі**

**З 8 па 12 лютага ў беларускай сталіцы пройдзе XXIV Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш. Сёлета ўдзел у ёй возьмуць прадстаўнікі 31-й краіны.**

Сярод новых удзельнікаў — Грэцыя. Ужо традыцыйна, акрамя Беларусі, свае кніжныя навінкі прадставяць Азербайджан, Венесуэла, Вялікабрытанія, Германія, Ізраіль, Іран, Італія, Казахстан, Карэя, Кітай, Куба, Малдова, Пакістан, Палесціна, Польшча, Расія, Сербія, Сірыя, Славакія, ЗША, Таджыкістан, Туркменістан, Турцыя, Украіна, Фінляндыя, Чэхія, Швейцарыя, Швецыя, Эквадор. Ганаровым госцем выстаўкі сёлета стане Злучанае Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі. Падчас імпрэзы пройдзе каля 300 мерапрыемстваў. **Першы намеснік міністра інфармацыі Ігар ЛУЦКІ** ўдакладніў:

— У мерапрыемствах знойдуць сваё адлюстраванне такія тэмы, як 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, 135-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, юбілейныя даты Пімена Панчанкі, Янкі Брыля і іншых пісьменнікаў. Адбудзецца ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі». Упершыню будуць ушанаваны пераможцы конкурсу маладых літаратараў «Першацвет».

8 і 9 лютага падчас выстаўкі пройдзе міжнародны сімпозіум літаратараў «Пісьменнік і час», які сёлета будзе прысвечаны 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. Як адзначыў **намеснік міністра інфармацыі Алесь КАРЛЮКЕВІЧ**, пра сваё жаданне ўдзельнічаць у гэтым сімпозіуме ўжо заявілі прадстаўнікі 17 краін. «Падчас гэтых сустрэч, круглых сталоў будуць абмяркоўвацца варыянты прэзентацыі дзейнасці Францыска Скарыны і самой даты 500-годдзя беларускага кнігадрукавання ў 2017 годзе і ў нашай краіне, і ва ўсім свеце», — заўважыў намеснік міністра.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** nina@zviazda.by

■ Надвор'е

# МАРАЗЫ ВЯРТАЮЦЦА

**Ужо на наступным тыдні на поўначы краіны прагназуецца да мінус 21 градуса**

**Апошні месяц зімы можа сапраўды пацвердзіць рэпутацыю сваёй назвы. Калі на выхадныя будзе слабамарозна і са снегам, то ўжо на наступным тыдні сур'ёзна пахаладае, паведамляе намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**


Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

У пятніцу на тэрыторыі Беларусі будуць гаспадарыць атмасферныя франты, калі на большай частцы краіны пройдзе снег і мокры снег. Чакаецца слабы туман і галалёд. На асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад мінус 5 градусаў да 1 цяпла. Чакаецца, што ў суботу пераважна па паўднёва-ўсходняй частцы краіны пройдзе кароткачасовы снег. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—9 марозу, удзень будзе ад нуля да мінус 6 градусаў. У нядзелю ўначы будзе пераважна без ападкаў, раніцай і ўдзень у асобных раёнах пройдзе невялікі снег. Тэмпература паветра ўначы панізіцца да 3—10 градусаў, у паўночных раёнах пры праясненнях будзе нават да 13 марозу. Аднак удзень ізноў прагназуецца ад нуля да мінус 7 градусаў.

А вось на наступным тыдні ў Беларусі чакаецца пахаладанне. У панядзелак тэмпература паветра на працягу сутак складзе мінус 3—10 градусаў, а ў паўночна-ўсходніх раёнах панізіцца да 11—16 марозу. Пераважна па паўднёвай частцы Беларусі пройдзе кароткачасовы снег.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у аўторак і сераду чакаецца марознае, пераважна без ападкаў надвор'е, толькі па поўдні краіны магчымы кароткачасовы снег. Стане сапраўды холадна, калі тэмпература паветра ўначы складзе мінус 10—17 градусаў, удзень — 7—13 марозу. Больш моцныя маразы прагназуюцца па паўночным усходзе краіны, дзе ўначы пры праясненнях будзе да мінус 18—21 градуса, пры гэтым удзень чакаецца мінус 14—16 градусаў. Разам з тым па паўднёвым захадзе на працягу сутак чакаецца толькі мінус 5—10 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** kurkach@zviazda.by

■ На слыху

# ЗОНА НА МЯЖЫ

**Цяпер, каб трапіць на тэрыторыю Расійскай Федэрацыі з Беларусі, неабходна будзе прайсці праз пагранічны кантроль**

**Рашэнне аб устанаўленні пагранічнай зоны на мяжы з нашай краінай у Смаленскай, Пскоўскай і Бранскай абласцях прыняў кіраўнік расійскай Федэральнай службы бяспекі Аляксандр Бортнікаў. У хуткім часе будуць вызначаны месцы і час для ўезду і праходжання асоб, а таксама транспартных сродкаў у пагранічную зону, устаноўлены папераджальныя знакі.**

— Рашэнне кампетэнтных органаў Расійскай Федэрацыі аб устанаўленні пагранічнай зоны ў межах прылеглай да расійска-беларускай граніцы тэрыторыі Пскоўскай, Смаленскай і Бранскай абласцей з'яўляецца ўнутранай справай Расійскай Федэрацыі, — адзначыў **афіцыйны прадстаўнік Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі Антон БЫЧКОЎСКІ**. — Афіцыйнай інфармацыі аб прыняцці гэтага рашэння ў Дзяржаўны пагранічны камітэт не паступала.

У верасні 2014 года ў мэтах стварэння дадатковых умоў для рэалізацыі органамі пагранічнай службы Беларусі задач і функцый, ускладзеных на іх заканадаўствам, Прэзідэнт нашай краіны падпісаў указ № 433, накіраваны на ўключэнне ў прыгранічную тэрыторыю шэрагу адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак на беларуска-расійскім участку Дзяржаўнай граніцы. «Выданне гэтага ўказу дазволіла арганізаваць больш цеснае ўзаемадзеянне органаў пагранічнай службы Беларусі і пагранічных органаў Расійскай Федэрацыі па сумесным супрацьдзеянні транзітнай нелегальнай міграцыі, наркатрафіку і незаконнаму перамяшчэнню праз дзяржаўную мяжу таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў, — удакладніў Антон Бычкоўскі. — На гэты момант, па меркаванні Дзяржпагранкамітэта, гэтага цалкам дастаткова для забеспячэння пагранічнай бяспекі. Таксама варта адзначыць, што паняцце «пагранічная тэрыторыя» і «пагранічная зона» не з'яўляюцца тоеснымі як з пункту гледжання беларускага, так і расійскага заканадаўства. Па тлумачэнне аб парадку ўезду, уваходу і знаходжання ў пагранічнай зоне Расійскай Федэрацыі варта звяртацца да пагранічнай службы Расіі».

Нагадаем, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 9 студзеня падпісаў указ аб усталяванні бязвізавага парадку ўезду і выезду замежных грамадзян на тэрыторыю нашай краіны. Дакументам прадугледжаны бязвізавы парадак уезду ў Беларусь на тэрмін не больш як 5 сутак пры выездзе праз пункт пропуску Нацыянальны аэрапорт «Мінск» для грамадзян 80 дзяржаў. Указ распаўсюджваецца на 39 краін Еўропы, уключаючы ўвесь Еўрасаюз, а таксама Бразілію, Інданезію, ЗША, Японію і іншыя — гэта спрыяльныя ў міграцыйным плане дзяржавы, стратэгічныя партнёры Беларусі і тыя краіны, якія ў аднабаковым парадку ўстанавілі бязвізавы рэжым у адносінах да нашых грамадзян.

**Вераніка КАНЮТА.**
kanyuta@zviazda.by

ПРАМАЯ ЛІНІЯ

## Усё, што вы хацелі спытаць аб жыллёвым заканадаўстве

**Ці падлягае падаткаабкладанню падораная кватэра? Ці можна прадаць кватэру, пабудаваную з дапамогай ільготнага крэдытавання? Як падзяліць асабовыя рахункі? Што рабіць, калі суседзі пастаянна шумяць? Ці магчыма выселіць уласніка з кватэры?**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Гэтыя і іншыя пытанні можна было задаць на прамой тэлефоннай лініі, якая праходзіла ў «Звяздзе» 2 лютага. Госцем нашай рэдакцыі была адвакат спецыялізаванай юрыдычнай кансультацыі №3 па прававым забеспячэнні здзелак з нерухомасцю Мінскай гарадской калегіі адвакатаў Святлана КАСЦЕВІЧ.**

***— Добры дзень! Гэта Алена Германаўна Сізько з Віцебска вам тэлефануе! У мяне да вас такое пытанне: майму сыну, грамадзяніну Рэспублікі Беларусь, падарылі аднапакаёвую кватэру ў Віцебску. Але сам ён ужо 10 гадоў жыве і працуе ў Пецярбургу. Ён хоча прадаць гэтую кватэру, а таксама памяняць грамадзянства. Скажыце, з чаго яму пачаць? І як будзе з падаткамі?***

— Алена Германаўна, у нашай краіне замежныя грамадзяне, а таксама асобы без грамадзянства маюць роўныя жыллёвыя правы з грамадзянамі Рэспублікі Беларусь. Так што няма ніякай розніцы: будзе ён прадаваць кватэру як грамадзянін Рэспублікі Беларусь ці як грамадзянін іншай дзяржавы. Але паколькі ваш сын з'яўляецца нерэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, гэта значыць ён знаходзіцца больш чым 183 дні ў каляндарным годзе за межамі Беларусі, то яму трэба будзе заплаціць падатак з продажу кватэры. Падатковая інспекцыя лёгка дакажа яго адсутнасць у Беларусі на працягу згаданага перыяду, таму што месца працы ў яго ў Расіі. І, калі ён прадасць кватэру, то атрымае дакод на нейкую суму, і на гэтую суму можа быць налічаны падатак. Але я вам раю ўдакладніць гэта пытанне ў падатковай інспекцыі па месцы знаходжання кватэры.

*(Працяг прамой лініі чытайце ў наступных нумарах «Звязды».)*

**Святлана БУСЬКО.** busko@zviazda.by

# Шлях Жэкі

## Ад падвала з пацукамі да ўласнага брэнда

**Страсяні калейдаскоп — і каляровыя шкельцы складуцца ў новы мудрагелісты ўзор. Здаецца, так проста. Іншая справа, мяняць «малюнкі» ва ўласным жыцці. Тут даводзіцца «ламаць» сябе, парываць са старымі знаёмымі, вырашаць розныя задачкі. Так было ў жыцці дызайнера Яўгена Бычкоўскага. Калі б вы яго сустрэлі шэсць гадоў таму, не паверылі б, што гэты дваровы хлопчык з Баранавіч хутка стане паспяховым бізнесменам. Брытагаловы, з «тунелямі» ў вушах, Жэка некалькі дзясяткаў разоў трапляў у поле зроку міліцыі з-за свайго захаплення графіці і тусовак у сумніўных кампаніях. Але вось ён жыццёвы калейдаскоп: рэзкае ўстрэсванне — і Яўген трапляе ў новае асяроддзе, абзаводзіцца марай стварыць сваю швейную фабрыку, і гэта пры тым, што да гадоў 17-ці хлопец не ведаў, як запраўляць нітку ў іголку. Сёння сумкі, клатчы, гальштукі пад брэндам «BYCKOVSKI», створаныя па ягоных эскізах, можна ўбачыць не толькі ў беларускіх, але і замежных моднікаў. Усяго за 11 месяцаў яго кампаніі ўдалося стварыць 55 працоўных месцаў. У найбліжэйшых планах — адкрыць па краіне каля дзесяці магазінаў. І гэта ў 22 гады!**



Не трэба свае няўдачы спісваць на крызіс, недахоп вопыту, ведаў. Каб да нечага прыйсці, трэба проста пачаць рухацца. «Мне будзе прыемна, калі мой прыклад некага падштурхне на канструктыўныя змены ў сваім жыцці», — падкрэсліў Яўген, калі пагадзіўся падзяліцца сваёй гісторыяй з чытачамі «Звязды».

— У падлеткавым узросце захапіўся графіці. Але пазней зразумеў, што наўрад ці такі занятак дапаможа мне нечага дасягнуць у жыцці. Пачаў рабіць татуіроўкі, бо гэта можна было хоць неяк манетызаваць. Наогул, я заўсёды лічыў, што не бацькі абавязаны мне, а я ім. Ідзя перастаць быць абузай, утрыманцам была для мяне дастаткова назойлівай. І вось мне 16—17 гадоў, я ўжо сам зарабляю грошы, але атачэнне складвалася не самае прыемнае. Я не з тых, хто вінавацціць у праблемах некага іншага. Але ўпэўнены, калі б побач са мной былі іншыя людзі, то памылак я зрабіў бы меней. Безумоўна, нешта дрэннае пераймаеш, бо падпускаеш да сябе пэўных людзей. Скажам так, тусуешся з наркаманамі — будзеш наркаманам, са злодзеямі — будзеш злодзеем. Пра мяне гаварылі: «Жэка, ты трапіш у турму». А я думаў, можа гэта і прыкольна...

Але быў у мяне адзін знаёмы, які хадзіў у царкву. З ім мы пастаянна спрачаліся адносна рэлігіі, бо я быў адчайным атэістам. У нейкі момант я падумаў, калі Бога і няма, то ў царкве ў цэлым гавораць правільныя рэчы. Вырашыў схадзіць у храм. І тут я зразумеў, што са мной усё ў парадку да сённяшняга дня толькі таму, што Ён клапаціўся пра мяне. Калі я гэта ўсвядоміў, адчуў, што трэба завязаць з тым, чым займаўся раней.

***— Хіба так проста ўзяць і ўсё перакрэсліць?***

— Успомніце, якое бывае расчараванне, калі на камп'ютары набралі тэкст, падымаеце вочы на экран, а там — англійскія літары. А калі так у жыцці? Сапраўды складана пачынаць наноў, тым больш па новых правілах. Я паступіў ва ўніверсітэт на спецыяльнасць «псіхолаг і настаўнік працы ў дзяўчынак», проста туды праходзіў па балах. Там вучылі шыць, прычым мне спачатку нечым касмічным здавалася, як нітка запраўляецца ў машынку. Даволі хутка новыя веды спатрэбіліся. У мяне знік заплечнік, і я вырашыў пашыць яго сам са старых джынсаў. У галаве паўстаў малюнак, якім ён павінен быць. Шыў я амаль месяц, звычайная машынка не спраўлялася, іголкі ламаліся, бо я задаваў шалёную хуткасць. І няхай заплечнік атрымаўся крываваты, але фішка была ў дызайне. Некаторым сябрам спадабалася, і яны папрасілі, каб ім пашыў нешта падобнае.

***— Шыць вы пачалі ў 17 гадоў, а ў 20 ужо адкрылі ў Баранавічах уласную краму. На тое, каб стаць спецыялістам, пайшло зусім няшмат часу. Як так?***

— У літаратуры мне сустракаліся падыходы, што чалавеку ў любой дзейнасці трэба 10 тысяч гадзін, каб стаць прафесіяналам. Проста хтосьці траціць на справу гадзіну ў суткі, а я ўвесь дзень. Таму атрымалася хутка. Безумоўна, першыя рэчы, якія я шыў, не адрозніваліся асаблівай якасцю, але людзям падабаўся дызайн, ідэя.

Я ўпэўнены, што многія з маіх аднакурсніц да гэтага часу не ўмеюць шыць. У мяне да справы быў іншы падыход. Можна кроіць крывымі нажніцамі, а я адразу ж купіў сабе раскроечны столік, спецыяльныя нажы і брытвы, каб усё рабіць акуратна. Мне быў цікавы сам працэс, тым больш, я бачыў, што той вопыт, які атрымаў, калі рабіў татуіроўкі, аказаўся патрэбным. Старыя веды, разуменне колеру, формы накладаліся на іншую сферу. Заставалася толькі новыя ідэі «сшываць» ніткамі. Усяму вучыўся сам, праводзіў эксперыменты. Калі адна машынка не шые, значыць, патрэбна іншая. Захацеў павялічыць шывок — залез у механізм. Я не кажу, што гэта крута, але калі няма грошай, проста даводзіцца ўсім займацца самому. Акрамя таго, адна справа, шыць з тканіны — можна набыць сабе кавалкі ў некалькі сантыметраў, а скуру так не прадаюць, яе трэба набываць пачкамі. Для таго каб пачаць шыць, мне трэба было 500 долараў. Грошай не хапала, я вырашыў прадаць тэлефон, крыху свайго адзення. Аўтастопам ездзіў на скураныя камбінаты. Часам мог вяртацца ні з чым, бо не ўсе заводы працавалі з фізічнымі асобамі. Даводзілася шукаць розныя рашэнні, безумоўна, не абыходзілася без памылак.

***— Так, і першая майстэрня была ў звычайным падвале?..***

— Спачатку я кроіў на каленях. Бацькі сварыліся, што паўсюль на падлозе раскладзены матэрыялы, інструменты, выкрайкі. Уначы не пашыеш, бо машынка шуміць. Я быў абмежаваны ў дзеяннях, таму пачаў шукаць выйсце, каб займацца тым, што падабаецца. Трапіўся падвал у шматкватэрным доме, ён быў завалены смеццем, якое давялося выносіць. Замахнуўся і на яго рамонт, бо цяжка працаваць, калі адчыняеш дзверы і па трубе пацук бяжыць. І зноў усё рабіць давялося самому, з падлогай дапамог прыяцель.

***— А як за год удалося з майстэрні-падвала пераброацца ў асобны офіс і наладзіць вытворчасць?***

— Раней я марыў, што буду зарабляць тысячу долараў. А калі ў нейкі момант абарот перавысіў гэту суму, падумаў: калі гэтыя грошы раздаць работнікам, кампанія можа зажыць новым жыццём. Разам з сябрам пачалі набіраць каманду і за год развіліся да 55 працоўных месцаў. Між іншым, у штаце ёсць і псіхолаг. Як правіла, на такія рэчы ніхто не траціцца, але гэта невялікая інвестыцыя, якая дазваляе сачыць за ўнутраным станам супрацоўнікаў, каб у іх усё было ў парадку і на рабоце, і дома.

***— Ці патрэбны беларусам у такі няпросты з пункту гледжання эканомікі час «перламутравыя гузікі»?***

— Многія дызайнеры лічаць, што іх прадукцыя павінна каштаваць дорага, і прадаюць яе за 300—500 долараў, не ўлічваючы аўдыторыю, яе кашалькі. А пасля пачынаюць гаварыць, што нікому дызайнерскія рэчы не патрэбны, што ў нашай краіне гэта не цэніцца. Я лічу: дызайнерская рэч павінна быць даступнай. У мяне атрымліваецца танны «перламутр», таму што ўсё больш людзей хочуць яго набываць. Калі падобныя рэчы каштуюць дорага, хутчэй за ўсё на нейкім этапе тут моцна накруцілі. Часта дызайнеры бяруць многа грошай, калі не ўмеюць дэлегаваць сваю адказнасць. Яны самі прымаюць заказы, шыюць, шукаюць матэрыялы. Таму хочуць атрымаць і ўсе заробкі: піяр-менеджара, швачкі, бухгалтара...

***— Як удаецца спалучаць вучобу ў дзвюх ВНУ і працу?***

— Я расставіў прыярытэты і ўзяў акадэмічны адпачынак. Некаторыя баяцца перапыніць вучобу, а ў гэтым няма нічога страшнага. Вы атрымліваеце час. Можа праз год вы не будзеце мець патрэбы ў тым, каб працягваць вучобу, а можа, наадварот, прыйдзеце з новымі сіламі. Я хацеў бы ўсім пажадаць, каб у іх жыцці не было страху. Пачынайце дзейнічаць, нават, калі спачатку ёсць сумненні. Не шкадуйце аб тым, што нешта не атрымалася. Шукайце сябе і выйгравайце.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
*dziadziula@zviazda.by*






# ...Нязручныя работнікі?




Фота Надзеі БУЖАН.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

А вось шчодрымі выплатамі да свят часцей радуюць жанчын. У адным з лістоў работніца расказала, што ў яе на прадпрыемстве прэміі да 8 Сакавіка большыя за тыя, што даюць да 23 лютага. Да таго ж жанчыны з дзецьмі атрымліваюць надбаўку да Дня маці, а сямейныя мужчыны — не.

Падчас праекта быў зроблены таксама агляд вакансій у інтэрнэце. Эксперты праманіторылі больш за 5 тысяч аб'яў. З іх 6 працэнтаў утрымлівалі дыскрымінацыйныя патрабаванні па ўзросце, поле і знешніх даных. І калі для прафесіі танцоўшчыцы шоу-балета крытэрый знешнасці аргументаваны, то ў выпадку з вакансіямі адміністратара ці памочніка кіраўніка ён недарэчны.

## ПЫТАННІ АБ ПРЫВАТНЫМ

Па статыстыцы заробак беларускіх жанчын на 24 працэнты меншы за мужчынскі. Гэта пры тым, што 55 працэнтаў жанчын, якія працуюць, маюць вышэйшую адукацыю (сярод работнікаў мужчынскага полу такіх 38 працэнтаў). Атрымліваецца, дамы не могуць манетызаваць свой дыплом.

Па звестках за 2015 год, у сувязі з ліквідацыяй арганізацыі, скарачэннем штату было звольнена 1,4 працэнта работнікаў-мужчын і 3,7 працэнта жанчын.

— Яшчэ адна праблема — сумяшчэнне прафесійных і сямейных абавязкаў. Гэта таксама ўплывае на тое, якую стратэгію занятасці выбіраюць жанчыны, — мяркуе **старшыня праўлення арганізацыі «Гендарныя перспектывы» Ірына АЛЬХОЎКА.**

Разам з тым пры інтэрпрэтацыі статыстыкі трэба ўлічваць многія акалічнасці.

— Калі бачым узровень аплаты працы, трэба прааналізаваць, колькі мужчын занята на цяжкіх работах, — звяртае ўвагу **Жанна ТАРАСЕВІЧ, дырэктар Бізнес-саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя Куняўскага.** — Так, сярод мужчын меншы працэнт работнікаў з вышэйшай адукацыяй. Але, магчыма, яны працуюць на тых вакансіях, дзе дыплом універсітэта не патрабуецца. Што да звольненых у сувязі з ліквідацыяй прадпрыемства ці скарачэннем штату, то трэба паглядзець, у якіх галінах гэта адбываецца. Плюс мужчыны звычайна не чакаюць банкруцтва арганізацыі, яны раней пачынаюць шукаць новае месца.

А пытанні на сумоўях, непасрэдна не звязаныя з прафесійнымі абавязкамі, часта задаюць, каб зразумець, як задзейнічаць патэнцыйнага работніка. Можа, яму варта прапанаваць гнуткі графік ці надомную работу.

— У банкаўскай анкеце бачыла пытанне: «Ці любіце вы жывёл?» Здавалася б, навошта гэта інфармацыя наймальніку? Вельмі проста. У чалавека, які любіць жывёл, высокі ўзровень спачування. Такога непажадана адпраўляць працаваць у крэдытны аддзел: ненадзейныя кліенты на яго могуць націснуць, каб атрымаць грошы. У выніку ўзровень незваротаў стане большым. А гэта нявыгадна банку, — прыводзіць прыклад Жанна Тарасевіч.

## СУДЗІЦЦА БЕСПЕРСПЕКТЫЎНА

Летась у аддзел па наглядзе за захаваннем правоў і свабод грамадзян упраўлення па наглядзе за выкананнем заканадаўства і законнасцю прававых актаў Генеральнай пракуратуры паступіла 2,6 тысячы зваротаў. І ні адзін з іх не тычыўся дыскрымінацыі па прыкмеце полу ў працоўнай сферы. За мінулы год не было заведзена крымінальных спраў за неабгрунтаваную адмову жанчыне ў прыёме на работу ці звальненне па матывах яе цяжарнасці.

— Адсутнасць заяў не азначае, што праблемы не існуе. Правапарушэнні ў гэтай сферы вельмі латэнтныя, — лічыць **пракурор аддзела Аляксандр СВАТКО.** — Абывацель думае, што судзіцца па такіх пытаннях бесперспектыўна: лепш патраціць гэты час на пошук іншай работы. Да таго ж ён баіцца панесці рэпутацыйныя рызыкі, наймальнікі ж між сабой кантактуюць.

## ГАРАНТЫІ ДЛЯ СЯМЕЙНЫХ МУЖЧЫН

Чаму наймальнікі лічаць жанчын з дзецьмі «нязручнымі» работнікамі? Адна з прычын — ільготы, якімі дзяржава забяспечвае маці. Напрыклад, жанчын з малымі да 5 гадоў нельга звольніць, а шматдзетным маці прадпрыемствы абавязаны прадастаўляць адзін свабодны дзень на тыдзень, у чым работадаўца, натуральна, не зацікаўлены.

**У кожнай шостай гісторыі дамы расказвалі, што яны атрымлівалі адмову ў прыёме на работу, бо на гэту пасаду наймальнік планаваў узяць мужчыну.**

— Наша задача — абараніць тых, хто не можа канкураваць як роўныя, — тлумачыць наяўнасць падобных ільгот **намеснік начальніка ўпраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацабароны Вольга ЧАМЯРКО.** — Жанчына з дзіцем да 5 гадоў, верагодна, будзе праводзіць менш часу на працоўным месцы. Але яна павінна мець магчымасць рэалізаваць свой працоўны патэнцыял.

У міністэрстве разумеюць, што ў ільгот ёсць і пабочны эфект, але адмяніць іх было б няправільна. Па словах **Алены КОМЛІК, галоўнага спецыяліста аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі ведамства,** аптымальны шлях — забяспечваць і мужчын такімі гарантыямі. Каб наймальнік ведаў, што ўзяць мужчыну — не значыць цалкам застрахавацца сябе.

— Цяпер мы хочам увесці абавязковы водпуск па доглядзе за дзіцем для татаў, — нагадвае Алена Комлік. — Ён не будзе працягłым, каб у работадаўцы не ўзнікала пытання наконт таго, хто будзе займаць месца мужчыны ў гэты час. Ужо ёсць напрацаваныя практыкі, трэба думаць, што лепш упішацца ў нашу рэальнасць.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

■ За кадрам

## ...ШТО ДОКТАР ПРАПІСАЎ

**Ток-шоу для вопытных, маладых і будучых бацькоў «Дзіцячы доктар», якое стартавала летась на канале «Беларусь 1», адзначае першую гадавіну. ...Пры любым узроўні развіцця медыцыны дзеці хварэлі, хварэюць і будуць хварэць — гэта аксіёма. Рэч толькі ў тым, як сустрэнуць чарговую балячку бацькі: спакойна і ў поўным інфармацыйна-лекавым узбраенні або ў паніцы, абапіраючыся хіба на бабуліны пужалкі, народныя забабоны і рэкамендацыі суседкі. Дапамагае ў гэтай барацьбе якраз ток-шоу «Дзіцячы доктар», якое чатыры разы на тыдзень, што называецца, з першых вуснаў дае адказы на актуальныя пытанні дзіцячага здароўя.**



Вядучыя сямейна-медыцынскай перадачы — не тэлежурналісты, а сучасныя практыкуючыя педыятры Вольга Кардаш, Дзмітрый Часноў і Валерый Андрыенка, якія за кадрам працягваюць весці прыём маленькіх пацыентаў у беларускіх клініках, а на здымачную пляцоўку да іх прыходзяць больш вузкія спецыялісты — кардыёлагі, неўролагі, псіхолагі, отарыналарынголагі, хірургі і прадстаўнікі іншых сфер дзіцячай медыцыны. «Звязда» пабывала на здымках ток-шоу і даведалася, як адчуваюць сябе ўрачы ў ролі медыяперсон, ці менш стала ахвотнікаў лячыцца праз інтэрнэт і ці плануе ў будучыні «наш адказ доктару Камароўскаму» мяняць фармат.

...На пляцоўцы кожны заняты сваёй справай: вядучы і запрошаны эксперт-медык падрабязна разглядаюць пэўную тэму дзіцячага здароўя, дэманструюць медыцынскія і бытавыя тэхнічныя навінкі, даюць карысныя парады. Дарослыя госці ўважліва слухаюць спецыялістаў (сёння, напрыклад, на павестцы дня «Дзіцячага доктара» — грудное выкормліванне, вітамін Д, прастуда ў немаўлят і такая хвароба, як адэноідыт); дзеці ж — як мае быць — гуляюць у сваім цацачным гарадку з размалёўкамі, канструктарамі, калыскамі, машынкамі, кубікамі... Час ад часу хто-небудзь з асабліва гарэзлівай малечы бяжыць пахваліцца сваімі поспехамі бацькам або цішком падбіраецца да доктарскай тумбы — але гэта ніяк не адбіваецца на здымачным працэсе, наадварот, толькі спрыяе больш нефармальнай і даверлівай атмасферы.



«Спачатку ўжыцца ў ролю тэлевядучага было складана, — прызнаецца Дзмітрый Часноў, — хоць тэма і блізкая з прафесійнага пункту гледжання, але ўрач і шоумэн — дзве зусім розныя прафесіі. Давялося многаму вучыцца, каб правільна трымаць сябе і весці гутарку на здымачнай пляцоўцы. Але дзякуючы калектыву, які заўжды дапамагае і падказвае, гэта нарэшце атрымалася, і сёння папраўкі ад рэдактара, рэжысёра атрымліваем усё менш. Тым больш што сцэнарый у нас не распісаны да дробязяў, ёсць толькі тэматычны «ствол» перадачы з асноўнымі адгалінаваннямі, але ў некаторых момантах мы можам паэксперыментаваць, дадаць нейкі асабісты вопыт, пажартаваць — гумар у гэтай справе, на мой погляд, наогул абавязковы, і найлепшыя выпускі атрымліваюцца пры ўдзеле вясёлых, дасціпных экспертаў».

Урачы трымаюцца перад камерамі так упэўнена, што лішнія дублі тут робяць рэдка — хіба толькі для ўступнага і развітальнага слоў ды запісу апладысментаў. «Мы так разы тры паўтаралі», — спачувальна гаворыць адна са старэйшых дзяўчынак, назіраючы за стараннямі дарослых.

— Вось, глядзіце, сучасны небулайзер, — дэманструе доктар адзін з дапаможнікаў пры лячэнні прастуд. — Хто смелы, хто вырашыцца выпрабаваць на сабе?

— Я! — дружна падбягаюць адразу некалькі дзяўчат.

— Праўда, ён вельмі зручны і зусім бясшумны?

— Не, шумны! — не менш дружна раптам адгукаюцца дзеці.

— А я нічога не чую, — разгублена прыслухоўваецца педыятр, але малеча хорам крычыць: «Чуваць, чуваць!» — выклікаючы дружны рогат усіх прысутных.

Пад канец заняткаў трэнер-інструктар Марына Панкова па традыцыі праводзіць з дзецьмі аздараўленчую гімнастыку, заахвоціўшы да практыкаванняў і бацькоў. «Ат, якая маладзец, усіх разварушыла!» — хваліць нябачны рэжысёр. «Гэта мы разам з дзядзькам Дзімам прыдумалі», — прызнаецца трэнер, а «дзядзька Дзіма» — загадчык прыёмнага аддзялення сталічнай 3-й дзіцячай бальніцы Дзмітрый Часноў — толькі хітравата ўсміхаецца ў вусы і прапануе дзецям пачаставацца карысным кісламалочным напоем — «можаце маму пачаставаць, альбо нават доктара, а вось выплюхваць на сябе і на доктара лепш не трэба». Пакуль ідзе «перазменка» перад запісам наступнага выпуску ток-шоу, Дзмітрый Міхайлавіч падсумоўвае вынікі амаль гадавой работы ў праграме:

— Я штодня размаўляю з мамамі, і прыемна чуць ад іх, што ўсё больш людзей глядзяць нашу праграму і ўдзячныя ёй за веды, за тое, што гэта інфармацыя ідзе ад першакрыніц — нашых экспертаў, урачоў-прафесіяналаў высокага ўзроўню. Спадзяюся, што адпаведна ўсё менш людзей звяртаюцца па дыягназ свайму дзіцяці ў інтэрнэт, асабліва на «мамскія» форумы.

***— Наколькі вялікае значэнне ў дачыненнях з бацькамі мае асоба самога ўрача? Педыятраў-мужчын у нас не так шмат, і, можа, да вас часцей прыслухоўваюцца?***

— У грамадстве ўсё яшчэ існуюць стэрэатыпы наконт як быццам «чыста жаночых» прафесій, такіх, як педагог, выхавальнік, дзіцячы ўрач, таму да нас стаўленне больш насцярожанае. Аднак калі ўжо доўгі час працуеш у гэтай сферы, то даводзіцца чуць: «Як добра, што ў нас сёння ўрач-мужчына!» Бо псіхалогія ўзаемаадносін жанчыны з дзецьмі і мужчыны з дзецьмі зусім розная яшчэ на генетычным узроўні.

— Па маіх назіраннях, узровень даверу да ўрачоў, незалежна ад полу, прыкладна аднолькавы. Праўда, мы можам даваць рэкамендацыі больш настойліва і строга, чым жанчыны-педыятры, — далучаецца да гутаркі яшчэ адзін вядучы «Дзіцячага доктара» Валерый Андрыенка. — У жанчын стаўленне да маленькіх пацыентаў больш мацярынскае, спачувальнае — а ў медыцыне гэтых эмоцый быць не павінна, трэба, каб лячэнне праходзіла па ўсіх нормах.

***— Сёння «Дзіцячага доктара» гледачы ўсё яшчэ параўноўваюць са «Школай доктара Камароўскага» або ў беларускай праграмы склалася сваё адметнае аблічча і стыль?***

— Доктар Камароўскі як педыятр — выдатны прафесіянал, няма пытанняў. Але таксама гэта ўжо брэнд, на які працуе вялізная каманда ўрачоў розных спецыяльнасцяў, і з яго харызмай папулярна данесці да гледачоў пэўны медыцынскі матэрыял вельмі лёгка. Але ў нас ёсць свае ўрачы, не менш вопытныя і прафесійныя, таму мы арыентуемся менавіта на беларускія рэаліі і дзелімся з гледачамі не сваім асабістым меркаваннем, а запрашаем разнастайных экспертаў, якія больш поўна і глыбока дапамагаюць разгледзець тую ці іншую тэму, ад груднога выкармлівання да псіхалогіі школьнікаў.

— Словам, можна адказаць коратка: не параўноўваюць нас з доктарам Камароўскім, — запэўнівае Валерый Андрыенка.

«Не скажу, што сёння адкрыла для сябе штосьці невядомае, — падзялілася ўражаннямі адна з матуль, — у мяне ўсё ж двое дзяцей, ёсць пэўны вопыт. Але некаторыя рэчы забываеш, пэўныя нормы з цягам часу мяняюцца, і нават у простых, паўсядзённых рэчах ёсць нюансы, якія не лішне паўтарыць або ўдакладніць у канкрэтных урачоў».

Зрэшты, за мінулы год праграма заваявала давер не толькі бацькоў, але таксама і саміх беларускіх медыкаў. «Мы ўзнімаем тэмы не глыбокія, часам, здаецца, нават вiдавочныя, але ў той жа час вострыя, бо яны хвалююць практычна кожную сям'ю, — зазначаюць вядучыя. — І бывае, што калегі, калі на прыёме папросту не хапае часу на падрабязную кансультацыю, раяць пацыентам: пагледзіце праграму «Дзіцячы доктар», яе можна лёгка знайсці ў інтэрнэце — там усё раскладзена па палічках».

2 лютага праграме споўніўся роўна год, і да гэтай даты творчая група падрыхтавала спецыяльную тэму «Нам годзік: што мы ўмеем». «Дзеці — наша ўсё, — усміхаецца кіраўнік праграмы Наталля Шаруба, — таму мы запрасілі ў госці сапраўднага імянінніка, і не толькі зрабілі маленькае свята з дапамогай эколага, які падказаў, як выбраць правільныя ласункі, дзіцячы посуд, упрыгожанні, свечкі і г.д., але і разам з урачом-неўролагам праверылі, што ўмее аднагадовае дзіця. Атрымаўся адначасова і святочны, і карысны выпуск».

***— Дзень нараджэння — час не толькі прымаць віншаванні, але і строіць планы на будучыню. Ці чакаць гледачам перамен у «Дзіцячым доктары»?***

— Наконт новых вядучых або павелічэння эфірнага часу дакладна сказаць не магу, але ўсё магчыма. А вось у змесце пэўныя перамены мы рыхтуем. Цяпер мы гаворым пра немаўлят раз на тыдзень, але заўважылі, што бацькі цікавяцца гэтай тэмай часцей, літаральна ў кожнай праграме гучаць пытанні. Таму задумалі стварыць у праграме асобны «дзіцячы пакой», дзе будзе жыць немаўля, — пакуль нават не вырашылі, будзе гэта лялька або сапраўдны маленькі чалавек, — і пастаянна гаварыць пра яго здароўе і развіццё.

***P.S.*** **«Дзіцячы доктар» вядзе прыём на канале «Беларусь 1» з аўторка па пятніцу ў 14.20. Запісацца на ўдзел у праграме можна на афіцыйных старонках у сацыяльных сетках або па тэлефоне (8-017) 389 62 01.**

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

■ Актуальна

## КІНО — ПА КАТЭГОРЫЯХ

**3 лютага ўступіла ў сілу пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь №81 (ад 15.12.2016 г.), паводле якой усе фільмы, прызначаныя для паказу на тэрыторыі нашай краіны, класіфікуюцца паводле тэматыкі, жанру, зместу і адносяцца да пэўных узроставых катэгорый.**

Устаноўлены наступныя індэксы:

0 — без узроставых абмежаванняў;

* — дзецям да 12 гадоў прагляд фільма дазволены ў суправаджэнні бацькоў або педагога;

** — дзецям да 14 гадоў прагляд фільма дазволены ў суправаджэнні бацькоў або педагога;

*** — фільм дазволены для паказу гледачам, старэйшым за 16 гадоў;

**** — фільм дазволены для паказу гледачам, старэйшым за 18 гадоў;

Э18 — эратычны фільм, дазволены для паказу гледачам ад 18 гадоў

■ Тэлесеткі

## «ЕЎРАБАЧАННЕ» НАДЗЕНЕ КАРАЛІ

**Украіна вызначылася са сloганам і дызайнам лагатыпа сёлетняга міжнароднага песеннага конкурсу. Краіна-гаспадыня «Еўрабачання-2017» сустрэне гасцей заклікам Celebrate Diversity — «Адзначаем разнастайнасць».**




Як заўважыў выканаўчы прадзюсар конкурсу Ён Ола Санд, гэты слоган дапаўняе леташнюю тэму Come Together («Аб'яднацца») і ляжыць у аснове каштоўнасцяў «Еўрабачання», адначасова аб'ядноўваючы жыхароў розных краін і падкрэсліваючы ўнікальнасць кожнай з іх. Заклік дапоўнены адметным лагатыпам, заснаваным на традыцыйных украінскіх каралях — намісце (у фальклорнай традыцыі гэта адначасова традыцыйнае жаночае ўпрыгажэнне і абярэг, сабраны з мноства розных пацерак, — сімвал прыгажосці і здароўя).

Таксама днямі Кіеў атрымаў ад папярэдняй сталіцы «Еўрабачання» Стакгольма сімвалічныя ключы ад конкурсу. Крыху пазней адбылася папярэдняя жараб'ёўка краін-удзельніц, паводле якой прадстаўнік Беларусі, гурт Naviband, выступіць на конкурсе ў другой палове другога паўфіналу 11 мая. Кампанію беларусам складуць прадстаўнікі яшчэ 18 краін: Аўстрыі, Балгарыі, Венгрыі, Даніі, Ізраіля, Ірландыі, Літвы, Македоніі, Мальты, Нарвегіі, Нідэрландаў, Расіі, Румыніі, Сан-Марына, Сербіі, Харватыі, Швейцарыі і Эстоніі.

Нагадаем, удзел у сёлетнім конкурсе песні «Еўрабачанне», які пройдзе ў Кіеве з 9 па 13 мая, пацвердзілі 43 краіны.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

■ Медыяпрастора

## ЧЫТАЦЬ, ЗДЫМАЦЬ, ПАДЗЯЛІЦЦА

**На пачатку лютага на радыё «Беларусь» стартаваў фотаконкурс «Мая кніга да ўсяго свету», прымеркаваны да 500-годдзя беларускага і славянскага кнігадрукавання.**

Для ўдзелу ў творчым спаборніцтве трэба ў тэрмін да 30 красавіка даслаць на электронную пошту booksgoglobal@gmail.com здымак з выявай сваёй любімай кнігі і тэкставы каментарый да яго. Аўтары самых крэатыўных і цікавых работ, якія збяруць найбольш галасоў інтэрнэт-карыстальнікаў і прафесійнага журы, атрымаюць прызы.

**Вікторыя ЗАХАРАВА**

## наступны тыдзень

**ШАЛІ.** Удача будзе спадарожнічаць вам як на працы, так і ў асабістым жыцці. Але не спяшайцеся з прыняццем важных рашэнняў, будзьце асцярожныя ў сваіх учынках. Калі паступіць прапанова адправіцца ў цікавую паездку, ні ў якім разе не адмаўляйцеся: змена абстаноўкі пойдзе на карысць. Будзьце асцярожныя са стыхіямі — агнём і вадой, — каб пазбегнуць дробных непрыемнасцяў.

**СКАРПІЁН.** На гэтым тыдні будзе значна больш карысна не спадзявацца на вернае «а можа», а выкарыстоўваць свае здольнасці і цвярозы разлік. Цяга да прыгод і нестандартных учынкаў прывядзе вас у новую кампанію. Магчыма, спачатку будзе крыху складана ў ёй асвоіцца. Але праз некаторы час вы зразумееце, што з гэтымі людзьмі вам лёгка і прыемна мець зносіны. Вам раскажуць пра нешта, што стане вашым хобі.

**СТРАЛЕЦ.** Выдатны час, каб праявіць ініцыятыву. Калі ўдасца перамагчы ляноту, атрымаецца ажыццявіць нават самыя смелыя планы. Прычым выдаткаваўшы на гэта мінімум намаганняў. Падрыхтуйцеся да барацьбы з самім сабой, усе свае намеры правярайце цвярозым разлікам, пазбягаючы імпульсіўных учынкаў. Больш пазітыву, і поспех вам усміхнецца.

**КАЗЯРОГ.** Дэвізам тыдня будзе пажаданне зорак — павер у сябе сам. Нечаканае павышэнне па службе заспее вас знянацку. Новыя абавязкі акажуцца няпростымі, а таму давядзецца выдаткаваць нямала часу, перш чым вы разберацеся, што да чаго. Ваш галоўны вораг — вы самі. Каб стаць пераможцам у гэтай бітве, вам неабходна сумленна і справядліва ацаніць сябе і матывы, якія вамі кіруюць, а таксама навучыцца верыць у свае сілы і здольнасці, і не баяцца іх выкарыстоўваць у поўнай меры.

**ВАДАЛЕЙ.** Будзьце асцярожныя і прадбачлівыя на працягу ўсяго тыдня — існуе высокая верагоднасць таго, што вы будзеце неаб'ектыўныя ў сваіх меркаваннях і дзеяннях. Але сітуацыя, якая будзе складацца на гэтым тыдні, можа вельмі станоўча адбіцца на вашай прафесійнай дзейнасці. Гэты час удалы для вядзення перамоў, заключэння здзелак і падпісання дагавораў, накіраваных на будучы поспех і фінансавы росквіт. Толькі не трацьце самавалодання.

**РЫБЫ.** Дробныя непрыемнасці і магчымыя перашкоды толькі разахвоцяць вас. Яшчэ з большай упартасцю будзеце наближацца да вызначанай мэты. І калі не зменшаць тэмп, усё задуманае ўвасобіцца ў жыццё ў пятніцу. Вам будуць дадзены ўсе магчымасці. Застаецца толькі праявіць максімум працавітасці. Ваша старанная акупіцца не толькі ўзрастаннем матэрыяльнага дабрабыту, але і паляпшэннем вашых пазіцый і ў адносінах з навакольнымі людзьмі і ў сям'і.

## Чацвер, 9 лютага

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.45** Зона Х.
**9.10** Нашы.
**9.25, 22.10 Серыял «След».***
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 20.00 Серыял «Практыка».***
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».***
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Афіцэрскія жонкі». 1-я серыя.***
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20, 0.00** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.40** Буйным планам.
**0.35** Дзень спорту.
**0.50 Серыял «Маскоўскі дэкамерон».***

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.35** Тэлебарометр.
**9.05, 18.40 Серыял «Кухня».***
**10.15, 17.20 Дэтэктыў «Такая работа».***
**11.00, 16.30 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».***
**11.55, 22.45 Серыял «Шурачка».***
**12.25, 19.45** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**14.15, 21.30, 22.05** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20, 23.15** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.00, 23.55** «Анлайн. Па-за сіцы». Скетчкам.
**18.10** «Пра ежу».
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабрападанак».
**7.35** «Беларуская кухня». Дзедкі.
**8.05, 11.20, 20.20** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.40 «Кураж». Драма.***
**9.10, 13.45 «Паляўнічыя ў прэрыях Мексікі». Вестэрн. 2-я серыя.***
**10.20** «Гітара па крузе».*
**11.35** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**12.05** «Край».
**12.30, 0.00** «Дыя@блог». Пра мову.
**12.55, 19.35 «Доктар Жыва-га». Драма.***
**14.55** «Майстры і куміры». Надзея Мікуліч.
**15.45, 21.05** «Невядомыя сама́лёты». Дак. фільм.*
**16.25 «Людзі на балоце. Палеская хроніка». Кінаэпапея. «Дні надзей», «Глыбокая баразна».***
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**8.00, 19.45** PRO спорт. Навіны.
**8.10** Слэм-данк.
**8.40** Хакей. КХЛ. «Сочы» — «Тарпеда» (Ніжні Ноўгарад).
**10.40** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — «Нёман» (Гродна).
**12.40** Міні-футбол. Кубак Беларусі. Фінал.
**14.35** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Віцязь» (Маскоўская вобл.).
**16.35** Біятлон. Чэмпіянат свету. Змяшаная эстафета.
**18.05** Лёгкая атлетыка. Сусветны тур-2017. Бостан.
**19.55** «Перамога каманды пачынаецца з цябе». Дак. фільм.
**20.25** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. БГК імя Мяшкова (Беларусь) — «Пік» (Венгрыя). (У перапынку — PRO спорт. Навіны).
**22.10** Біятлон. Чэмпіянат свету. Змяшаная эстафета.
**23.40** Фактар сілы.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.20** «Смак».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».***
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** «Трэба разабрацца».
**21.30 Серыял «Грачанка».***
**23.05 Серыял «Скарлет».***
**0.35** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.20** «Дарагая перадача».
**9.40, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40, 0.20 «Водблiскi». Серыял.**
**12.30, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**15.40 «Следакі». Серыял.**
**16.10** «Скардзіцца дазваляецца».
**16.50** «Мінск і мінчане».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Дзіўная справа».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».

### МІР

**6.10** М/ф.
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00 Серыял «Золата скіфаў».***
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** Дак. фільм «Сямейныя драмы».
**14.15** Шоу «Няма праблем!»
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара».***
**19.20, 5.00 Серыял «Закон і парадак. Аддзел аператыўных расследаванняў».***
**22.10 Маст. фільм «Лекцыі для хатніх гаспадынь».***
**23.55 Маст. фільм «Таямнічая карта».***
**2.25 Серыял «Шырокая рака».***

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Васіліса».**
**19.10, 20.40 Серыял «Крутыя берагі».**
**21.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**22.00, 23.10 Серыял «Асінае гняздо».**
**0.05** «Паядынак».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10 Серыял «Адвакат».***
**7.00** «Дзелавая раніца НТБ».
**8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара».***
**9.45, 23.05** «НЗ.by».
**10.25 Серыял «Пчаляр».***
**12.05** Суд прысяжных.
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00** «Тайны следства».
**14.25 Серыял «Шэрыф».***
**16.40 Серыял «Апошні мент».***
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.45 Серыял «Куба».***
**21.20 Серыял «На глыбіні».***
**23.25** «Вынікі дня».
**23.55 Серыял «Падарожжы Сіндбада».***

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**11.00 Трылер «Экіпаж».*****
**13.15 Серыял «Блізняты».***
**14.10 Баявік «Скалалаз».*****



**15.55, 19.15, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад».
**17.00** «Мой любімы гадаванец».*
**17.30 Серыял «Людзі ў дрэвах».***
**18.15 Серыял «Падмані мяне».***
**19.00** «Фэшн is my прафэшн».
**19.20 Серыял «Гульня ў маўчанку».*****
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».*
**21.15 Камедыя «Містар і місіс Сміт».*****
**23.10 Серыял «Амерыканская гісторыя жахаў».*****

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Тры каты».
**7.05** М/ф «Ёка».
**7.20** М/ф «Прыгоды Дзіна».
**7.35** М/ф «Маша і мядзведзь».
**7.45** М/ф «Машыны казкі».
**7.50** М/ф «Фіксікі».
**8.00** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Вароніны».
**9.30** Камедыя «На мора!»**
**11.30** Скетчкам «Студэнты».
**12.00, 5.00** Серыял «Сакратар».
**13.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.00, 20.00** Серыял «Вы ўсе мяне прыводзіце ў шаленства».
**15.00, 00.50** Серыял «Маладзёжка».
**16.00** Серыял «Мамачкі».
**17.00, 23.10** «Уральскія пельмені».
**19.00** Серыял «Закрытая школа».
**21.00** Камедыя «Вячэра з прыдуркамі».**
**0.00** Еўрапейскі покерны турнір.
**2.00** «Не можа быць!»
**3.00** Серыял «Нанакаханне».
**4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**4.30** «Лаві момант».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.45** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 0.05** «Расследаванні камісара Мегрэ». Серыял.
**12.45, 20.45** «Правілы жыцця».
**13.15** «Расія, любоў мая!». «Карачаева-Чэркесія: сямейныя традыцыі».
**13.40** «Дні Турбіных». Маст. фільм.
**14.50** Колер часу. П. Пікаса.
«Дзяўчынка на шары».
**15.10, 22.25** «Заняпад цывілізацый». Дак. фільм.
**16.05** «Ігар Майсееў. Я ўспамінаю... гастроль даўжынёю ў жыццё».
**16.55** «Усевалад Якут. Мой свет — тэатр». Дак. фільм.
**17.35** Майстры фартэпіяннага мастацтва. Сяргей Рэдзькін і Сяргей Бабаян.
**18.30** Да Дня расійскай навукі. «Леў Зільбер. Паляванне на вірусы». Дак. фільм.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**21.10** «Валянцін Курбатаў. Нечаканы партрэт». Дак. серыял.
**21.40** «Культурная рэвалюцыя».
**23.15** «Адлюстраваны час». Дак. серыял.
**0.00** Мастсавет.
**1.40** М. Равель. Іспанская рапсодыя для аркестра.

### Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Наш «Погляд»: праз 20 гадоў». 2007 год.***
**6.45** Маладзёжная праграма «Вясёлыя рабяты». 1990 год.***
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».*
**9.40, 11.00, 14.35, 15.40, 17.00, 18.50, 20.35, 21.40, 23.00, 0.55, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.*
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаны ў СССР».*
**12.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2008 год.***
**13.00** Тэлеспектакль «Гульцы».***
**14.50, 20.50** «Прэс-экспрэс» .1995 год.***
**17.15** «Я сама». Тэма: «Вось я і дабілася свайго». 1995 год.*
**18.00** «Эліта Краіны Саветаў». Валянцін Фалін. 2007 год.*
**19.10** Фільм-спектакль «Юнона і Авось».***
**0.00** 18 The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2006 год.
**1.10** Маст. фільм «Дэжа вю».***
**5.30** «Голас народа». 1991 год. (Маналогі ў «Будцы галоснасці»).***

### EuroSport 1

**3.00, 6.00, 10.30, 21.00, 2.00** Зімовыя віды спорту.
**3.30** Хакей. Універсіяда.
**4.30, 6.30** Лыжныя гонкі. Універсіяда.
**5.00, 7.00, 8.30, 11.30, 14.00, 18.00** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету.
**8.00, 11.00** Фрыстайл. Універсіяда.
**16.00** Біятлон. Універсіяда.
**16.30, 20.00, 2.45** Біятлон. Чэмпіянат свету.
**21.45** Снукер. Сусветны Гран-пры.

### Кінакамедыя

**0.50** Камедыя «Багіня».***
**2.40** Камедыя «Мамулі».***
**4.15, 14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».***
**5.00** Камедыя «Усё магу».***
**6.35** Камедыя «Кур'ер».***
**8.25** Камедыя «Ас з асаў».***
**10.20** Камедыя «Замуж на 2 дні».***
**12.15** Камедыя «Бамбіза Салман».***
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».***
**16.15** Меладрама «Як выйсці замуж за мільянера» (4-я серыя).*
**17.10** Камедыя «Чатыры таксісты і сабака-2».***
**19.30** Камедыя «Выкідала».****
**21.10** Камедыя «Каманда мары».***
**22.55** Камедыя «Вяселлі і іншыя непрыемнасці».***

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.30, 14.45** «Ёсць адзін сакрэт».
**7.55** «Доктар І...»
**8.25, 19.00, 2.55** «20 хвілін». Серыял.
**10.10, 4.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.50** «Сляпая».
**12.45** «Варажбітка».
**13.45** «Паралельны свет».
**15.15** «Здзелка».
**15.50** «Натуральны адбор».
**16.45, 21.50** «Рэвізора».
**18.00** «Тайны следства». Серыял.
**20.55, 2.05** «У майго дзіцяці шостае пачуццё».
**23.10** «Вокладка».
**23.40** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.25** «Фарсаж-3». Баявік.

### ТБ1000

**6.10** «Сцежкі».***
**8.15** «Герцагіня».***
**10.15** «Іншыя».***
**12.10** «Планета 51».*
**13.50** «Ілюзіяніст».***
**15.50** «Закаханы Шэкспір».0
**18.05** «Сцежкі».***
**20.10** «Чарнільнае сэрца».*
**22.10** «Іствікскія ведзьмы».***
**0.25** «Гіпнатызёр».****
**2.35** «Пачатак».*
**5.05** «Паштальён».***

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** «Завея».****
**7.55** «Ёлкі 1914».
**9.50** «Рускі трохвугольнік».***
**12.05** «Новы Адэон».***
**13.25** «Снайпер: Апошні стрэл».*
**15.00** «Агні прытона».***
**17.00** «Я таксама хачу».****
**18.30** «Прыкідваючыся ахвярай».***
**20.20** «Забава».***
**22.15** «Прэзумпцыя віны».***
**0.15** «Адна вайна».***
**2.00** «Ведзьма».***
**4.10** «Вораг нумар адзін».***

### National Geographic

**6.00, 13.15, 20.15** Гульні розуму.*
**6.45, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.55, 11.00, 14.45** Мегазаводы.
**8.45, 15.30** Міжнародны аэрапорт Дубай.***
**9.30, 17.50** Золата Юкана.*
**10.15** Зніклы: пошук Кодзі Дэйла.*
**11.45, 16.20, 19.25, 21.00, 23.25, 2.30** Расследаванні авіякатастроф.***
**12.30, 1.45** Космас: прастора і час.*
**18.35, 21.45, 4.45** Гісторыя Бога з Морганам Фрыменам.***
**22.40** Паранармальнае.***

### Discovery

**8.00, 14.00, 19.00, 0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.*
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена? *
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена? *
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі.*
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на склады.***
**11.00** Як уладкаваны Сусвет.*
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.*
**18.00** Інжынерныя праліkі.*
**20.00** Вялікая нафта Ірака.*
**1.00, 6.20** Не спрабуйце паўтарыць.***
**2.00, 4.40** Маланкавыя катастрофы.***

# ШАШКІ

**Выпуск №30**

Часта для атрымання пераможнага выніку ў шашачнай гульні неабходна спалучаць строга пазіцыйную гульню з камбінацыйнымі матывамі. Разгледзім цікавую пазіцыю з аналізу гросмайстра Юрыя Кірылава.

**№48**

**Белыя простыя шашкі:** a3, b2, b4, c1, e1, e3, f4, h2, h4 (9)

**Чорныя простыя шашкі**: b6, b8, d6, d8, f6, g5, g7, h6, h8 (9)

На першы погляд пазіцыя чорных горшая з-за звязкі. Аднак, у сваю чаргу, чорныя ладзяць калонкі і, выкарыстоўваючы камбінацыйныя пагрозы, дамагаюцца вырашальнай перавагі.

1 ... b8-c7! (пабудавана калонка з шашак b6, c7, d8 і адначасова пагражае камбінацыя fe5, bc5 +) 2.b4-a5 (пасля bc3 чорныя гуляюць ba5 і ўзаемная звязка ўжо на іх карысць) b6-c5 3.e3-d4 (вымушана, на любы іншы ход ідуць нескладаныя ўдары з выйгрышам) g5: e3 4.d4: f2 (на db6 вырашае ўдар ef2, c5, fg5 +) f6-g5 5.h4: f6 g7: e5 і моцная цэнтральная пазіцыя забяспечвае чорным выйгрыш. Калі ў пачатковай пазіцыі пабудаваць калонку іншым спосабам 1 ... d8-c7? 2.b4-a5 b6-c5 3.e3-d4 f4: d2 g5-f4 5.d2-e3 f4: d2 6.c1: e3 d6-c5 7.b2-c3 f6-g5 8. h4: f6 g7: e5 9.e3-f4 e5: g3 10.h2: f4, то атрымаецца толькі нічыя.

Для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі нашага чытача Міхаіла Стэфановіча (Гродна)

**№49**

**Белыя простыя шашкі:** c3, c7, d4, d6, e1, f6, g7 (7)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, a5, d2, e5, f4, g3, h8 (7)

**№50**

**Белыя простыя шашкі:** a1, a5, b4, c3, c5, g3, h4, h6 (8)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, a7, d6, d8, e3, e5, e7, f6, h8 (9)

У абедзвюх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.



Падведзены вынікі міжнароднага конкурсу па складанні шашачных праблем (шашкі=100), арганізаванага Асацыяцыяй французскіх шашачных праблемістаў (Amicale des Problemistes Francais). Пераможцам выйшаў літоўскі праблеміст Рымас Мацкявічус, найлепшым з беларускіх шашачных кампазітараў стаў Рыгор Краўцоў, у яго восьмае месца.

**Праверце свае рашэнні: выпуск №29 ад 20.01.17.**

№47 13...bc5! 14. db6 hg3 15. fh4 de5 16. fd6 hg5 17. hf6 ga1 з разгромам.

Дакладныя адказы даслалі В. Талкачоў (Клімавіцкі р-н), В.Ваўчкоў (Маладзечна), В. Бандарык (Мінскі р-н), В. Арцюхін, А. Ліцвіначук, П. і В. Шульга (Мінск), П. Аніканаў (Шчучын), А Шурпін (Клімавічы) І. Ананіч (Гродна).

*Пішыце па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, газета «Звязда».*

*e-mail: info@zviazda.by, або vorush@yandex.ru*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

## Пятніца, 10 лютага

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 1.40** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х.
**9.10** Нашы.
**9.25 Серыял «След».***
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 20.00 Серыял «Практыка».***
**12.10, 17.40 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».***
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Афіцэрскія жонкі».***
**21.00** Панарама.
**21.40** Жанчыны і спорт.
**22.10 Меладрама «Буду вернай жонкай».***
**2.00** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 23.35** Тэлебарометр.
**9.05, 18.45 Серыял «Кухня».***
**10.15, 17.20 Дэтэктыў «Такая работа».***
**11.10, 16.30 Серыял «Не прадзіся прыгожай».***
**12.00** «Анлайн. Па-за сеткай». Скетчкам.
**12.35, 19.50** «Тата папаў». Рэаліці-шоу.
**14.15** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20, 23.10** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.00** «Анлайн. Па-за сеці». Скетчкам.
**18.10** «Пра ежу».
**21.20, 22.05** «Бітва экстрасэнсаў. 14-ы сезон».
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.40 Фантастыка «Рыдзік».***

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Качка з дранікамі.
**8.05, 12.00, 20.20** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.40 «Кураж». Драма.***
**9.15, 14.25 «Юнацтва генія». Маст. фільм.***
**10.40** «Гітара па крузе».*
**11.35** «Сіла веры».
**12.20** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**12.50** «Навукаманія».
**13.15** «Камертон». Актрыса, рэжысёр і сцэнарыст Івана Жыган.
**13.40, 19.35 «Доктар Жывага». Драма.***
**15.55, 21.05 «Бум». Камедыя.***
**17.40** Канцэрт Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Беларусі імя Г.І. Цітовіча.
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**8.00, 20.00, 23.45** PRO спорт. Навіны.
**8.10** «Перамога каманды пачынаецца з цябе». Дак. фільм.
**8.35** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. БГК імя Мяшкова (Беларусь) — «Пік» (Венгрыя).
**10.10** Біятлон. Чэмпіянат свету. Змяшаная эстафета.
**11.40** На шляху да ЧС-2018. Відэачасопіс.
**12.10** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Сталіца» (Мінск) — ВітЭн» (Орша).
**13.40** «Жанчыны і спорт». Аляксандра Герасіменя.
**14.10** Хакей. КХЛ. «Югра» (Ханты-Мансійск) — «Дынама-Мінск».
**16.05** Фактар сілы.
**16.35, 22.40** Біятлон. Чэмпіянат свету. Спрынт. Жанчыны.
**18.05** Козел пра футбол.
**18.25** Гандбол. Чэмпіянат свету. Беларусь — Венгрыя.
**20.10** Лёгкая атлетыка. Міжнародны турнір. Берлін.
**23.55** Самба. Міжнародны турнір на прызы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.20** «Смак».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20** «Адваротны адлік». «Гетман Агінскі. Палеская авантура». Частка 1-я.
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10, 16.20** «Час пакажа».
**16.20 Камедыя «Верныя сябры».***
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».***
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05** Леў Лешчанка, Рыгор Лепс, Леанід Агуцін, Тамара Гвердцытэлі ў юбілейным канцэрце Сяргея Жыліна і аркестра «Фанограф».
**22.50 Драма «Каханне без адказу».***
**0.35** «Вячэрні Ургант».
**1.15** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.05** «Тайны Чапман».
**9.25** «Дарагая перадача».
**9.40, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40, 23.55 «Водбліскі». Серыял.**
**12.30, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Дзіўная справа».
**15.35 «Следакі». Серыял.**
**16.50** «Аўтапанарама».
**17.10** «Шчырая размова».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Рускія варагі». Дакументальны спецпраект.
**22.05** «Глядзець усім!»
**1.30** «Соль». Музычнае шоу.

### МІР

**6.00, 5.00** М/ф.
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00 Серыял «Золата скіфаў».***
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** Дак. фільм «Сямейныя драмы».
**16.15** «Сакрэтныя матэрыялы».***
**17.15 Серыял «Вяртанне Мухтара».***
**19.20 Серыял «Сівы конь».***
**23.00 Маст. фільм «Пунсовая кветачка».***
**0.10** «Трымайся, шоубіз!».*
**0.35 Маст. фільм «Рам і Лакхан».***
**3.20 Маст. фільм «Трэці лішні».***

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Васіліса».**
**19.10, 20.40 Серыял «Крутыя берагі».**
**21.40** «Пакой смеху».
**22.00, 23.10** «Петрасяншоу».
**0.05 Маст. фільм «Узрост кахання».****

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10 Серыял «Адвакат».***
**7.00** «Дзелавая раніца НТБ».
**8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара».***
**9.45, 23.25** «НЗ.by».
**10.25 Серыял «Пчаляр».***
**12.05** Суд прысяжных.
**14.00** «Тайны следства».
**14.25 Серыял «Шэрыф».***
**16.40 Серыял «Апошні мент».***
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.55 Серыял «Куба».***
**21.30 Маст. фільм «Узлом».***
**23.45 Серыял «Падарожжы Сіндбада».***

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**11.00 Камедыя «Містэр і місіс Сміт».****
**13.00 Серыял «Блізняты».***
**14.00 Трылер «Страказа».***
**15.55, 19.15, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад».
**17.15** «Адшукваецца адпачынак».
**17.45 Серыял «Людзі ў дрэвах».***
**18.30 Серыял «Падмані мяне».***
**19.20 Серыял «Гульня ў маўчанку».****
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Меладрама «Блакітны бераг».****
**23.10 Серыял «Амерыканская гісторыя жахаў».****

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Тры каты».
**7.05** М/ф «Ёка».
**7.20** М/ф «Прыгоды Дзіна».
**7.35** М/ф «Маша і мядзведзь».
**7.45** М/ф «Машыны казкі».
**7.50** М/ф «Фіксікі».
**8.00** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Варонiны».
**9.30** Камедыя «Пятніца».
**11.20** Скетчкам «Студэнты».
**12.00, 5.00** Серыял «Сакратар».
**13.00** «Паспецъ за 24 гадзіны».
**14.00** Серыял «Вы ўсе мяне прыводзіце ў шаленства».
**15.00, 0.30** Серыял «Маладзёжка».
**16.00** Серыял «Мамачкі».
**17.00, 20.00, 0.30** «Уральскія пельмені».
**19.00** Серыял «Закрытая школа».
**21.00** Камедыя «Усё магу».
**22.50** Жахі «Бабадук».
**2.00** «Не можа быць!»
**3.00** «Дурні і дарогі».
**3.30** Скетчкам «Студэнты».
**4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**4.30** «Лаві момант».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15** «Назіральнік».
**11.15** Дзень памяці А. С. Пушкіна. «Катыльённы прынц». Дак. фільм.
**12.10** Г. Свірыдаў. «Завея». Музычныя ілюстрацыі да аповесці А. С. Пушкіна.
**12.45** «Правілы жыцця».
**13.15** «Пісьмы з правінцыі». Кабардзіна-Балкарыя.
**13.40** «Старыя пісьмы». Маст. фільм.
**14.45** Колер часу. Ар-дэко.
**15.10** «Заняпад цывілізацый». Дак. фільм.
**16.05** «Ігар Майсееў. Я ўспамінаю... гастроль даўжынёю ў жыццё».
**17.00** «Царская ложа».
**17.40** Майстры фартэпіяннага мастацтва. Гала-канцэрт у гонар маэстра Сяргея Дарэнскага.
**19.10, 2.40** Сусветныя скарбы.
**19.45, 1.55** «Шукальнікі». «Невядомыя» Фёдара Рокатава.
**20.30** «Лінія жыцця». Яўген Вадалазкін.
**21.25** Дзень памяці А. С. Пушкіна. «Станцыйны наглядчык». Маст. фільм.
**22.30** «Тыя, з якімі я... Мікалай Пастухоў».
**23.45** Мастсавет.
**23.50** Партрэт пакалення. «Чайкі». Маст. фільм.
**1.25** «Буравеснік». «Фільм, фільм, фільм». М/ф для дарослых.

### Настальгія

**6.00** «Спяем, сябры!» з Тацянай Візбар. 2008 год.***
**7.00** Тэлеспектакль «Гульцы».***
**8.35, 9.40, 11.00, 12.50, 14.35, 15.40, 17.00, 19.00, 20.35, 21.40, 23.00, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.*
**8.50, 14.50, 20.50** «Прэс-экспрэс». 1995 год.***
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».*
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».*
**11.15** «Я сама». Тэма: «Вось я і дабілася свайго». 1995 год.*
**12.00** «Эліта Краіны Саветаў». Валянцін Фалін. 2007 год.*
**13.10** Фільм-спектакль «Юнона і Авось».***
**18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1988. 1-я частка. 2011 год.***
**19.20** Маст. фільм «Агледзіны».***
**22.00** «Колба часу».***
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Наш «Погляд»: праз 20 гадоў». 2007 год.***
**0.45** Маладзёжная праграма «Вясёлыя рабяты». 1990 год.***

### EuroSport 1

**3.30, 7.15, 8.30, 11.15, 14.45, 20.30, 1.30** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету.
**4.30** Біятлон. Універсіяда.
**5.00, 9.30, 16.30, 19.30, 2.45** Біятлон. Чэмпіянат свету.
**6.00, 10.30, 20.45, 2.00** Зімовыя віды спорту.
**6.45** Фрыстайл. Універсіяда.
**8.00** Лыжныя гонкі. Універсіяда.
**13.30, 16.00** Лыжнае двяебор'е. Кубак свету.
**18.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**19.00, 21.30** Зімовыя віды спорту. Універсіяда.
**22.00** Снукер. Сусветны Гран-пры.

### Кінакамедыя

**0.35** Меладрама «Сведка на вяселлі».***
**2.20** Меладрама «Круты паварот».***
**4.20** Драма «Гордасць».****
**6.25, 14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».***
**6.50** Камедыя «Спецагенты на адпачынку».***
**8.40** Баявік «Васабі».***
**10.25** Меладрама «Prada і пачуцці».***
**12.20** Камедыя «Ажанюся з першай сустрэчнай».***
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».***
**16.00** Драма «Нябёсы западветныя».*
**18.10** Камедыя «Падкідыш».
**19.30** Камедыя «Укол парасонам».***
**21.15** Мюзікл «Усе кажуць, што я кахаю цябе».***
**23.05** Камедыя «Ас з асаў».***

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.35, 14.45** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.00** «Доктар І...»
**8.30** «20 хвілін». Серыял.
**10.10, 4.25** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.50** «Сляпая».
**12.45** «Варажбітка».
**13.45** «Паралельны свет».
**15.15** «Здзелка».
**15.50** «Рыжыя».
**16.45** «Рэвізора».
**18.05, 3.35** «Бітва рэстаранаў».
**19.10, 2.10** «Прывітанне, я ваша пятніца».
**20.55** «1+1». Камедыя.
**23.00** «Гучныя справы».
**23.55** «Востраў». Фантастыка.

### ТБ1000

**8.10** «Планета 51».*
**9.55** «Іствікскія ведзьмы».***
**12.10** «Чарнільнае сэрца».*
**14.10** «Пачатак».*
**17.00** Пашталь'ён.***
**20.10** «Назад у будучыню».
**22.20** «Паляўнічыя на троляў».***
**0.20** «Іспанская—англійская».***
**2.40** «Вялікія вочы».***
**4.30** «Такія розныя блізняты».***

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** «Прэзумпцыя віны».***
**8.30** «Забава».***
**10.20** «Адна вайна».***
**12.05** «Цэнь». 0
**13.45** «Ведзьма».***
**15.30** «Вораг нумар адзін».***
**17.15** «Даўн Хаус».***
**18.50** «Мора».***
**20.20** «ПіраМММіда».***
**22.20** «Чалавек ля акна».*
**0.20** «Шапіто-шоу: каханне і сяброўства».****
**2.20** «КосцяНіка. Час лета».*
**4.20** «Скарбы В.К.».***

### National Geographic

**6.00, 13.10, 20.15** Гульні розуму.*
**6.50** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.40, 10.50, 14.40** Мегазаводы.
**8.30, 15.30** Міжнародны аэрапорт Дубай.***
**9.15, 11.40, 16.15, 19.25, 23.25, 2.40** Расследаванні авіякатастроф.*
**10.05** Зніклы: пошук Кодзі Дэйла.*
**12.25, 1.55** Космас: прастора і час.*
**18.35, 21.45, 5.05** Гісторыя Бога з Морганам Фрыменам.***
**21.00, 1.10, 4.15** Другая сусветная вайна: пекла пад вадой.***
**22.35** Паранармальнае.***

### Discovery

**8.00, 14.00, 0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.*
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена? *
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена? *
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі.*
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на склады.***
**11.00** Аляска: сям'я з лесу.*
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.*
**18.00** Скрозь кратовую нару.*
**19.00** Космас навыварат.*
**20.00** Паляўнічыя на рачныя дыяменты.***
**1.00, 6.20** Не спрабуйце паўтарыць.***
**2.00, 4.40** Маланкавыя катастрофы.*

## ПЕЎНЯ ПАСАДЗІЛІ Ў ТУРМУ

**У Гандурасе пасадзілі ў турэмную камеру пеўня, які стаў прычынай сваркі паміж двума жыхарамі горада Трухільё, паведамляе Daily Mail.**



Канфлікт пачаўся пасля таго, як мужчына выявіў на сваім участку птушку суседа. Яму не спадабалася, што яна залазіць на яго дрэвы і шуміць. Прэтэнзіі абурылі гаспадара пеўня, і мужчыны пачалі лаяцца. Калі адзін з іх прыгразіў забіць другога, суседзі выклікалі паліцыю. Вартавыя парадку, якія прыбылі на месца, не сталі арыштоўваць спрачальнікаў, а звезлі пеўня і адвезлі ў турму. Ны паабяцалі вярнуць яго, калі мужчыны памірацца. Турэмныя здымкі пеўня атрымалі папулярнасць у карыстальнікаў сацсетак у Гандурасе. Ці памірыліся пасля арышту птушкі яе гаспадар з суседам, не паведамляецца.

## СОКАЛЫ ЛЯТАЮЦЬ І САМАЛЁТАМІ

**Фотаздымак дзясяткаў паляўнічых сокалаў, якія сядзяць у салоне самалёта разам з пасажырамі, апублікаваны карыстальнікам партала Reddit.com, набыў вялікую папулярнасць у сецíве, а шэраг СМІ напісалі пра нейкага саудаўскага прынца, які набыў для 80 сваіх птушак пасажырскія білеты на самалёт.**



Сакалінае паляванне вельмі папулярнае ў ААЭ, таму нацыянальны перавозчык Etihad Airways пазначыў палітыку ў дачыненні да гэтых птушак. «Мы займаемся перавозкай сокалаў у галоўным салоне пасажырскага судна пры ўмове, што ўсе неабходныя дакументы атрыманы», — сказана на сайце авіякампаніі. Як піша The Daily Express, незразумела, якой кампаніяй перавозіліся птушкі і хто дазволіў узяць адразу столькі гадаванцаў у салон: большасць перавозчыкаў устанаўліваюць абмежаванні па колькасці. У ААЭ сокалам дазволена падарожнічаць нароўні са звычайнымі пасажырамі пры наяўнасці ў іх пашпарта, і з 2002-га па 2013 год урад выдаў больш за 28 тысяч сакаліных пашпартоў.

## ЛЮДЗІ ПАБЕГАЮЦЬ У ШКУРАХ

**У Новай Зеландыі адбудзецца радэа, на якім жывёл заменяць людзі ў авечых касцюмах. Арганізатары спаборніцтваў пайшлі на такі крок з-за забароны на выкарыстанне сапраўдных авечак, паведамляе The Age.**



У 2015 годзе арганізатары мерапрыемства даведаліся, што пагоня за авечкамі, адна з галоўных падзей Kakahi Rodeo, супярэчыць правілам, якія распрацавала новазеландскае міністэрства асноўных галін. З тых часоў яны шукаюць рашэнне гэтай праблемы. Летась жывёл паспрабавалі замяніць мяшкамі з поўсцю, якія цягалі за сабой на вяроўках клоўны. Эксперымент аказаўся няўдалым. У гэтым годзе будзе выпрабаваны іншы варыянт: на поле выйдуць людзі, апранутыя авечкамі. Арганізацыя SAFE, якая выступае супраць эксплуатацыі жывёл, заклікае да поўнага байкоту спаборніцтваў ■

## Нядзеля, 12 лютага

### Беларусь 1

**6.50 Меладрама «Мінулае ўмее чакаць».*****
8.30 Народная раніца.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Арсенал».
**9.40 Серыял «Сваты-4».***
10.50 «50 рэцэптаў першага».
11.40 Спецыяльны рэпартаж.
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35 Каробка перадач.
**13.10 Меладрама «Камінны госць».***
15.15 Твой горад.
15.30 Вакол планеты.
16.15 Тайны следства.
**16.50 Меладрама «Буду вернай жонкай».*****
20.35 Навіны надвор'я.
21.00 Галоўны эфір.
**22.05 Меладрама «Недатыка».***

### Беларусь 2

7.05 М/с «Сябры анёлаў».
**7.35 Фільм для дзяцей «Дзяўчынка з запалкамі».***
8.30, 21.00 Тэлебарометр.
8.35 «Нядбайнікі».
9.40 «Свет навыварат». Трэвел-шоу.
**10.30 Камедыя «Таўстун на рынгу».***
12.20 Біятлон. Чэмпіянат свету. Гонка праследу. Жанчыны.
13.05 «Каханне анлайн». Рэаліці-шоу.
14.05 «Універ-шэф».
14.40 Два рублі.
14.55 Анімацыйны фільм «Захавальнік сноў».0
16.35 Біятлон. Чэмпіянат свету. Гонка праследу. Мужчыны.
17.20 «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
18.15 Нас не падманеш.
**18.50 Дэтэктыў «Ілюзія падману-2».***
**21.30, 22.05 Камедыя «Таксі-4».*****
22.00 Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.15 Фантастыка «Рыдзік».*****

### Беларусь 3

7.50 «Беларуская кухня». Грыбны квас.
8.15, 13.35, 20.20 «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.35 «Раман і Францэска». Меладрама.***
10.05 «Музеі Беларусі». Нацыянальны парк «Белавежская пушча».
10.30 «Наперад у мінулае».
10.55 «Нацыянальны хіт-парад».
11.50 «Выйсце ёсць». Павел Латушка.
12.15 «Майстры і куміры». Рэжысёр, народны артыст Беларусі Барыс Луцэнка.
13.10 «Святыні Беларусі». Касцёл Найсвяцейшай Троіцы (г. Глыбокае).
13.55 «Я хачу гэта ўбачыць!» Іўе.
14.20 «Аўтограф». Міхаіл Дрынеўскі.
14.45 Канцэрт Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Беларусі імя Г.І. Цітовіча.
**15.50 «Без памяці заканы». Камедыя.***
**17.30 «Дзесяць негрыцянят». Дэтэктыў.***
19.40 «Апошні дзень». Вячаслаў Ціханаў.*
20.40 «Калыханка».
**21.05 «Жандар у Нью-Ёрку». Камедыя.***
22.45 М/ф.0

### Беларусь 5

8.00, 23.35 PRO спорт. Навіны.
8.10 Самба. Міжнародны турнір на прызы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.
9.10 Біятлон. Чэмпіянат свету. Спрынт. Мужчыны.
10.40 Тэніс. Кубак Федэрацыі. Прэв'ю.
11.00 Тэніс. Кубак Федэрацыі. Беларусь — Нідэрланды. Матчы адзіночнага разраду.
15.00 Тэніс. Кубак Федэрацыі. Беларусь — Нідэрланды. Матч парнага разраду.
17.10 Хакей для ўсіх.
17.40 Шорт-трэк. Этап кубка свету. Мінск.
21.15 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
21.45 Біятлон. Чэмпіянат свету. Гонка праследу. Жанчыны.
22.40 Біятлон. Чэмпіянат свету. Гонка праследу. Мужчыны.

### АНТ

7.00, 8.05 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00 (з субцітрамі), 16.00 (з субцітрамі) Нашы навіны.
8.00, 9.00 Нашы навіны (з субцітрамі).
9.05 «Нядзельная прапаведзь» (з субцітрамі).
9.20 М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».0
9.40 «Бесталковыя нататкі».
10.00 «Пакуль усе дома».
10.55 «Фазэнда».
11.30 Да юбілею Таццяны Тарасавай. «Лёд, якім я жыву».
**12.30 Камедыя «Водпуск за свой кошт».***
14.50, 16.20 Канцэрт Стаса Міхайлава.
17.05 «Найлепш за ўсіх! Рэцэпты выхавання».
18.35 «Найлепш за ўсіх!»
20.00 Контуры.
21.05 Нацыянальная музычная прэмія ў галіне папулярнай музыкі «Ліра».
**22.50 Драма «Каханне са слоўнікам».****
0.30 «Саша Сакалоў. Апошні рускі пісьменнік».

### СТБ

6.00, 8.00, 10.10, 11.40, 13.40, 16.00, 20.25, 0.05 «Дзень дзіўных гісторый».
7.40 «Скардзіцца дазваляецца».
9.45, 16.50 «Аўтапанарама».
11.00 «Вялікае снеданне».
13.30, 16.30 «24 гадзіны».
**14.25, 0.55 Камедыя «Дайце кнігу скаргаў».*****
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
17.20 «Ваенная тайна».
19.30 «Тыдзень».
**22.10 Маст. фільм «Карабельныя навіны».*****

### МІР

6.00 «Мільён пытанняў пра прыроду».
6.10 «Такія дзіўныя».
6.40 М/ф.
8.00 «Культ//Турызм».
8.30 «Беларусь сёння».
9.00 «Яшчэ танней».
9.30 «Любімыя акцёры 2.0».
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
**10.10 Серыял «Сівы конь».*****
13.30 «Зорка ў падарунак».*
**14.00 Маст. фільм «Каханне жыве тры гады».*****
**16.15, 22.00 Серыял «Фурцава. Легенда пра Кацярыну».*****
21.00 «Разам».
**23.30 Серыял «Пад вялікай Мядзведзіцай».*****

### РТР—Беларусь

7.00 «Пакой смеху».
**7.45 Маст. фільм «Колькі каштуе шчасце».***
11.00, 14.00 Весткі.
11.20 «Сам сабе рэжысёр».
12.10 «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
12.40 «Ранішняя пошта».
13.20 «Пакой смеху».
14.15 «Смяяцца дазваляецца».
**16.50 Маст. фільм «Старэйшая жонка».***
20.00 Весткі тыдня.
21.30 Ток-шоу «Што адбываецца».
**22.30 Маст. фільм «Асцярожна! Увакод дазволены».***
0.10 «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

6.10 «Астрапрагноз».
**6.15, 8.20 Серыял «Адвакат».*****
8.00, 10.00, 14.00, 16.00 Сёння.
8.50 «Іх норавы».
9.25 Ядзім дома.
10.20 «Першая перадача».
11.00 «Цуд тэхнікі».
11.55 «Дачны адказ».
13.00 «НашСпажыўНагляд».
14.20 «Таксама людзі».
**15.05 Серыял «Шэрыф».*****
16.20 «Следства вялі...»
18.05 «Новыя рускія сенсацыі».
19.00 «Вынікі тыдня».
**20.25 Маст. фільм «Пятровіч».*****
**22.15 Серыял «З жыцця капітана Чарняева».*****
23.50 «Таямнічая Расія».

### 8 канал

9.00, 14.50, 19.00, 20.55, 23.55 «Надвор'е».
9.05 «Мультпарад».
9.45 «Адшукваецца адпачынак».
10.15 «Мой любімы гадаванец».
**10.45 Серыял «Камісар Рэкс».*****
**11.30 Камедыя «Смерць ёй да твару».*****
**13.05 Камедыя «Мама Міа».*****
**14.55 «Глядзім усёй сям'ёй». Казка «Уладар стыхій».***
**16.35 «Глядзім усёй сям'ёй». Серыял «Аднойчы ў казцы».***
**18.05 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».*****
**19.05 Драма «Аварыйная пасадка».******
20.45 «Вечарніца».
**21.00 Драма «Хросны бацька-3».*****

### ВТБ

6.00, 23.30, 4.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
7.00 М/ф «Мія і я».
7.30 «Ералаш».
8.00 М/ф «Егіптус».
8.30 М/ф «Тры каты».
8.35 М/ф «Ёка».
8.50 М/ф «Прыгоды Дзіна».
9.10 М/ф «Фіксікі».
9.20 М/ф «Машыны казкі».
9.25 М/ф «Маша і мядзведзь».
9.30 М/ф «Аліса ведае, што рабіць».
10.00 Скетч-шоу «Асцярожна: дзеці!»
10.30 Серыял «Татавы дочкі».
11.30, 0.50 «Турбаміксер».
12.00 «Паспець за 24 гадзіны».
13.00 Серыял «Як я стаў рускім».
15.00 Драма «Баец».**
17.20 Анімацыйны фільм «Захавальнік Месяца».0
19.00 «Уральскія пельмені».
20.40 Драма «Уцёкі з Шаўшэнка».***
0.00 Еўрапейскі покерны турнір.
4.30 «Лаві момант».
5.00 «Празорлівая».

### Культура

6.30 «Еўраньюс».
10.00 «Звычайны канцэрт».
10.35 «Вясна». Маст. фільм.
12.15 «Расіцлаў Плят — мудрэц і клоўн». Дак. фільм.
13.00 «Расія, любоў мая!» «Усяго тры струны».
13.30 «Якія размаўляюць з бялухамі». Дак. фільм.
14.35 Геніі і ліхадзеі. Ота Шміт.
15.05 «Што рабіць?»
15.50, 2.40 Сусветныя скарбы.
16.05 «Вячаслаў Бутусаў. Абуджэнне радасці». Дак. фільм.
16.35 «Бібліятэка прыгод».
16.50 «Падарожжа да пачатку часоў». Маст. фільм.
18.15 «Пешшу...» Феадосія Айвазоўскага.
18.45, 1.55 «Шукальнікі». Легенда «Азёры Смерці».
19.30 «Людміла Гурчанка на ўсе часы». Вечар-прысвячэнне ў Маскоўскім тэатры мюзікла.
21.05 «Развітальныя гастролі». Маст. фільм.
22.15 «Блізкі круг» Андрэя Эшпая.
23.10 П.І. Чайкоўскі. «Яўген Анегін». Тэатр «Гелікон-опера». Аднаўленая пастаноўка К. С. Станіслаўскага 1922 года.
1.45 «Пярфіл і Фама». М/ф для дарослых.

### Настальгія

6.00, 12.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1988. 2011 год.***
7.00, 8.35, 9.40, 11.00, 14.35, 17.00, 20.35, 21.45, 23.30, 0.55, 2.30, 3.40, 5.00 Музычная настальгія.*
7.20 Маст. фільм «Аглядзіны».***
8.50, 2.50 «Прэс-экспрэс». 1995 год.***
9.00, 3.00 «Мінулы час».*
10.00 «Колба часу».***
13.05 «Дванаццаты паверх». Праграма для моладзі. 1988 год.***
15.00 «Быў час». 2009 год.***
16.00 Маст. фільм «Ахоўвай мяне, мой талісман».***
17.20 «Рок-н-рол ТБ». (Канцэрт гурта «Лига блюза». У тэатры Эстрады.) 1993 год.***
18.00 Фільм-спектакль «Маленькія камедыі вялікага дома». Спектакль Маскоўскага тэатра Сатыры.***
21.00 «... Да 16 і старэйшым». 1988 год.***
22.00 Маст. фільм «Жыццё і дзіўныя прыгоды Рабінзона Круза».***
0.00 «Эліта Краіны Саветаў». Валянцін Фалін. 2007 год.*
1.10 Фільм-спектакль «Юнона і Авось».***
4.00 «Народжаныя ў СССР».*

### EuroSport 1

4.30, 9.30 Лыжнае дваябор'е. Кубак свету.
5.00, 8.00, 13.30, 19.00 Горныя лыжы. Чэмпіянат свету.
6.00, 20.45, 2.00 Зімовыя віды спорту.
7.00, 12.00, 16.30, 1.05 Біятлон. Чэмпіянат свету.
10.00 Конны спорт. «Мастэрс».
15.30, 18.00 Скачкі з трампліна. Кубак свету.
21.50 Снукер. Сусветны Гран-пры. Фінал.

### Кінакамедыя

0.45 Камедыя «Шалёныя выкладчыкі».***
2.20 Драма «Гордасць».****
4.20, 15.40 Скетчкам «Паміж намі».***
5.20 Камедыя «Кур'ер».***
7.10 Меладрама «Круты паварот».***
9.10 Меладрама «Сведка на вяселлі».***
10.55 М/ф «Дабрыня Нікіціч і Змей Гарыныч».0
12.10 Камедыя «Ас з асаў».***
14.00 Камедыя «Бамбіза Салман».***
16.00 Камедыя «Багіня».***
17.50 Меладрама «Prada і пачуцці».***
19.45 Камедыя «Укол парасонам».***
21.25 Камедыя «Ажанюся з першай сустрэчнай».***
23.05 Камедыя «Вяселлі і іншыя непрыемнасці».***

### ТБ3

6.00 М/ф.
10.00 «Паненка і кулінар».
10.35 «Далёка і яшчэ далей».
11.35, 1.40 «Тайны следства». Серыял.
14.50 «Жонка. Гісторыя кахання».
16.15, 18.20 «Рэвізора».
20.55 «Без падману».
21.50 «Фарсаж-4». Баявік.
23.45 «Асцярожна, махляры».
0.15 «Звышнатуральнае». Серыял.
4.40 «Тайны двайнікоў».

### ТБ1000

6.10 «Іншыя».***
8.10 «Прывіды былых сябровак».***
10.10 «Экстрасэнс».***
12.10 «Назад у будучыню-2».
14.10 «Герцагіня».***
16.15 «Іншыя».***
18.15 «Планета 51».*
20.10 «Назад у будучыню-3».
22.20 «Апалуза».***
0.20 «А вось і яна».*
2.00 «Гіпнатызёр».****
4.05 «Іствікскія ведзьмы».***

### ТБ1000 Рускае кіно

6.20 «Сувязь». 209.***
7.55 «Ключ ад спальні».*
10.30 «Тата напракат».***
12.20 «Мастацтва жыць у Адэсе».****
14.25 «Мафія: гульня на выжыванне».***
16.20 «Ёлкі 1914».
18.30 «Каханне ў вялікім горадзе».***
20.20 «Сёстры».***
22.10 «Дом на абочыне».***



0.10 «Цяжкі выпадак».***
2.20 «Забава».***
4.25 «Прэзумпцыя віны».***

### National Geographic

6.00, 8.00, 9.35, 11.10, 13.05, 14.55, 15.40, 16.50, 17.35, 19.25, 20.35, 22.30, 0.00, 1.55, 3.00, 4.10, 4.55 Гульні розуму.*
6.45, 5.15 Навуковыя недарэчнасці.*
18.00 Ад калыскі да магілы.*

### Discovery

8.00 Аляска: сям'я з лесу.*
11.00, 7.10 Загадкі планеты Зямля.***
12.00, 21.00 Плутон: першая сустрэча.*
13.00, 22.00 Узрываючы гісторыю.*
14.00 Скрозь кратовую нару.*
15.00 Паляўнічыя на рачныя дыяменты.***
16.00, 23.00 Залатая ліхаманка.***
17.00, 1.00 Вялікая нафта Ірака.*
18.00 Паляўнічыя на склады: Брытанія.***
19.00 Ліквідатар.***
20.00 Даліны смерці.***
0.00 Махінатары.*
2.00 Стальныя хлопцы.***
4.40 Як уладкаваны Сусвет.*

■ Без тэрміну даўнасці

# «СПРАВА ПРЫТЫЦКАГА»

## Як Лаўрэнцій Цанава спрабаваў выжыць нацыянальнага героя Беларусі



**У 1949 годзе Сталін даў пачатак новай хвалі чыстак у партыйным апарце і сярод кіруючых адміністрацыйных кадраў. У Беларусі барацьбу «са здраднікамі і рэвізіяністамі» ўзначаліў міністр дзяржаўнай бяспекі БССР Лаўрэнцій Цанава.**

ВЫНІКАМ яго злачыннай дзейнасці з'явілася знішчэнне вялікай колькасці ні ў чым не вінаватых людзей, пераслед выдатных партыйных і дзяржаўных дзеячаў. Праваахоўцы Цанавы адчуў на сабе і Сяргей Прытыцкі, які ў той час працаваў першым сакратаром Гродзенскага абкама партыі. Цанава не мог дараваць, што абласны камітэт спрабаваў заклікаць да парадку разбэшчанага начальніка абласнога ўпраўлення дзяржбяспекі Фралова, які хадзіў у Цанавы ў «любімчыках».

«Справа Прытыцкага» спачатку будавалася вакол «прызнання» правакатара. Лаўрэнцій Фаміч паспрабаваў дыскрэдытаваць дзейнасць Прытыцкага ў камсамольскім і партыйным падполлі на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Ён уручыў першаму сакратару ЦК Кампартыі Беларусі Мікалаю Патолічаву ліст аб «падпольнай контррэвалюцыйнай дзейнасці Прытыцкага ў Польшчы». За гэтым лістом былі іншыя — на сваякоў Сяргея Восіпавіча, родных яго жонкі. Не выйшла.

Тады па загадзе Цанавы былі арганізаваны пошукі новых доказаў, і ў хуткім часе Прытыцкаму прад'явілі абвінавачанне ў «правакаванні паўстанцкіх настрояў у Гродзенскай вобласці». Справа набыла круты паварот. Толькі дзякуючы прынцыповай пазіцыі ЦК КПБ, а ў прыватнасці першага сакратара ЦК Патолічава, Прытыцкага ўдалося адстаяць.

«Я тры гады працаваў у апараце ЦК, прысутнічаў на кожным бюро, быў сведкам, што найважнейшыя прынцыповыя пытанні і іншыя рашэнні вырашаліся пры адсутнасці аднадумнай думкі, — казаў падчас свайго выступлення на V пленуме ЦК КПБ 24 ліпеня 1953 года сакратар Гродзенскага абкама партыі Каралёў. — Цанава заяўляў пра сваю нязгоду з тым ці іншым пытаннем, і неяк на гэтым згаджаліся, усякая крытыка меркаванняў была немагчымая. Такое ненармальнае становішча ў рабоце бюро ЦК КПБ працягвалася і пры таварышы Патолічаве. Карыстаючыся тым, што той па першым часе не мог ведаць кіруючыя кадры, іх добрыя якасці і недахопы, Цанава пры папушчальніцтве іншых членаў бюро прыцягваў патрэбных яму людзей, збіваў, шальмаваў непажаданых яму работнікаў...»

АДНЫМ з самых «вострых», прынцыповых і цікавых на тым пленуме было выступленне міністра юстыцыі БССР Івана Ветрава: «Замест таго каб заклікаць Цанаву да парадку, трэба сказаць, што з ім насіліся, падлізваліся да яго, сёй-той шукаў дружбы, садзейнічання, падтрымкі. Замест таго каб яго абсякаць, яго ўлагоджвалі. Каб дагадзіць Цанаве, знялі з працы нацыянальнага беларускага героя, якім з'яўляўся Сяргей Прытыцкі. А халуй і правакатар Фралоў стаў першым намеснікам Цанавы...»

На думку самога Прытыцкага, канфлікт паміж абкамам і абласным упраўленнем МДБ пачаўся ў 1949 годзе, калі першым сакратаром ЦК быў Гусараў. На нарадзе кіраўнікоў дэлегацый падчас вылучэння кандыдатур у ЦК КП(б)Б Сяргей Восіпавіч даў адвод кандыдатуры начальніка Гродзенскага абласнога ўпраўлення МДБ Фралова. Мікалай Патолічаў пачаткам канфлікту лічыў дату 18 ліпеня 1950 года, калі на пленуме абкама Прытыцкі і іншыя выступаючыя пакрытыкавалі работу органаў Міністэрства дзяржаўнай бяспекі падчас калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

У выніку бюро Цэнтральнага камітэта вырашыла паслаць у Гродзенскую вобласць камісію, якая прадставіла дакладную запіску з высновамі. Ставілася пытанне аб умацаванні кіраўніцтва, але было вырашана не вызваляць таварыша Прытыцкага ад працы. У гэтай складанай абстаноўцы бюро ўзялося дапамагчы Прытыцкаму.

...ЛІСТАПАД 1950 года. У гэты час Прытыцкі працягвае працаваць першым сакратаром абкама. У ЦК паступае вялікая запіска Цанавы, якая ставіць пад сумненне палітычную сумленнасць і прыстойнасць таварыша Прытыцкага. Раз Цанаве не ўдалося збіць яго такім шляхам, па дзелавых меркаваннях, ён вырашыў яго скампраметаваць палітычна. Патолічаў другі раз вымушаны быў паехаць у Цэнтральны Камітэт і па парадзе Малянкова ўнёс прапанову адклікаць Прытыцкага ў ЦК КПБ для таго, каб далей не ўскладняць абстаноўку.

Заслугоўвае ўвагі меркаванне нашага земляка — вядомага расійскага публіцыста і даследчыка, аўтара кнігі «Чыя Беларусь? Межы. Спрэчкі. Крыўды» Мікалая Зяньковіча: «Патолічаў тады (на ліпеньскім пленуме ЦК КПБ 1953 года. — **Аўт.**) не раскрыў змест запіскі Цанавы, абмежаваўшыся абстрактнай фразай аб яго (Прытыцкага. — **Аўт.**) палітычнай нядобранадзейнасці. Што ж у ёй было такога пякуча сакрэтнага, што сам Малянкоў параіў Патолічаву адклікаць Прытыцкага ў распараджэнне ЦК КПБ, гэта значыць фактычна зняць з пасады першага сакратара абкама?»

Ва ўспамінах Мікалая Патолічава, якія змешчаны ў кнізе «Сумленнем сваім не паступіся», ёсць такія радкі: «...Калі Цанава ўручыў першаму сакратару ЦК Кампартыі рэспублікі ліст аб «падпольнай контррэвалюцыйнай дзейнасці Прытыцкага ў Польшчы», прычым усё, што да гэтага часу было вядома пра гераічны подзвіг Прытыцкага падчас суда над камсамольцамі, уяўлялася ў іншым святле, расцэньвалася як правакацыйныя дзеянні, накіраваныя на тое, каб спрыяць разгрому Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Гэта быў вельмі разважлівы крок ворага....

У1953 годзе ў Маскве ў ЦК я зноў паставіў пытанне аб Прытыцкім. Мне сказалі: «Трэба рэабілітаваць Прытыцкага цалкам». Так мы і паступілі. Ён быў накіраваны першым сакратаром Баранавіцкага абласнога камітэта партыі. У наступныя гады ён працаваў першым сакратаром Маладзечанскага і Мінскага абкамаў партыі, сакратаром ЦК КП Беларусі, а затым Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларусі».

Атрымліваецца, што Сяргея Прытыцкага вярнулі на буйныя партыйныя і дзяржаўныя пасады толькі пасля ліквідацыі Берыі і арышту Цанавы. Пры іх тры гады Сяргея Восіпавіча трымалі ў якасці работніка ЦК КП(б)Б, намесніка загадчыка аддзела Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі. Праверылі сабранае на яго дасье? Фактычна гэта была перамога Цанавы і паражэнне Патолічава, нягледзячы на актыўную падтрымку яго Малянковым.

На думку беларускага пісьменніка Славаміра Антановіча, галоўным ратавальнікам Сяргея Прытыцкага ад Лаўрэнція Цанавы быў не Мікалай Патолічаў, а Міхаіл Зімянін. «У 1951-м годзе Міхаілу Зімяніну прыйшлося выконваць абавязкі першага сакратара ЦК КП(б)Б, — піша Славамір Антановіч. — У нядаўна арганізаваным калгасе Гродзеншчыны адбылася надзвычайная сітуацыя: сяляне з нейкай прычыны адмовіліся здаваць толькі што сабраны хлеб. Пра гэта адразу ж даведаліся і ў НКУС, першы — сам Цанава. Сяргей Прытыцкі, які ўзначальваў тады абкам партыі, не ўдзяліў гэтаму належнай увагі».

«Хлебнае пытанне» сапраўды ўдалося зняць. Свае памылкі прызналі і калгаснікі, і прадстаўнікі мясцовай улады, і Прытыцкі. Здавалася б, можна супакоіцца, але трывога не пакідала Зімяніна ўсю дарогу назад да Мінска. У вушах стаяла нярвовая, напружаная размова з Цанавам: «А я, таварыш Зімянін, сцвярджаю, што ваш Прытыцкі — буржуазны агент яшчэ з часоў дэфензівы!» Нарэшце Цанаву, здавалася, удалося пераканаць у адваротным, і ён пагадзіўся з довадамі свайго апанента, але даваць яму... Ён лічыў сябе ўсемагутным. Яшчэ б — жанаты на сястры самога Берыі!..» (Гэта не пацверджана дакументамі ці аўтарытэтнымі сведчаннямі. — **Аўт.**)

ЯК толькі Зімянін вярнуўся з паездкі з Цанавам на Гродзеншчыну, тэрмінова напісаў шыфраграму ў Крэмль, у якой пастараўся знячь усе магчымыя палітычныя нюансы. Быў упэўнены: Цанава парушыць сваё слова і будзе імкнуцца закруціць «справу», таму дакумент падрыхтаваў у вельмі строгім, максімальна канкрэтызаваным стылі. І сапраўды, «беларускі» Лаўрэнцій усё ж адправіў «маскоўскаму» Лаўрэнцію сваю дакладную на Лубянку зусім з іншымі высновамі. Праўда, раніцай наступнага дня...

Гэтыя дванаццаць гадзін розніцы паміж дзвюма шыфраграмамі прадвызначылі лёс многіх і многіх людзей: Берыя прынёс Сталіну свой матэрыял па Гродзеншчыне пазней, чым гэта зрабілі работнікі ЦК ВКП(б). Высновы, якія Зімянін выклаў у сваёй шыфраграме, пераканалі праўдай, што сітуацыя вычарпана.

Ён паморшчыўся ад прачытанага матэрыялу, падрыхтаванага ведамствам Берыі, перапыніў дыялог словамі: «Гэты... твой Цанава... то спазняецца, то спяшаецца... Прытыцкага я табе не аддам... Яго завербаваць польская дэфензіва не магла... Выпадак збіраг, што ён выжыў ад іх куль... Дарэчы, ты ж, Лаўрэнцій, візаваў праект Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб узнагароджанні яго ордэнам Леніна ў сувязі з 30-годдзем Беларускай рэспублікі...» І правадыр уважліва паглядзеў сваімі жаўтлявымі вачыма на «галоўнага чэкіста», чый погляд схаваўся за бляскам акуляраў. Словы Сталіна былі даверчай і ахоўнай граматай.

Такая рэакцыя «бацькі народаў» адтэрмінавала старанна падрыхтаваны «мінскім» Лаўрэнціем сцэнарый вялікага палітычнага пагрому ў Беларусі. Тым не менш Берыя з Цанавам вырашылі «запусціць» сваю рэпрэсіўную машыну пазней, але імклівыя падзеі 1953-га перакрэслілі іх крывавыя планы.

**Эмануіл ІОФЕ,**
**доктар гістарычных навук**

■ Векапомнае

# Папрасіць прабачэння, пакуль не позна

Да нядаўняга часу сусветная супольнасць не прызнавала такую катэгорыю ахвяр фашызму, як жыхары спаленых вёсак

**Міжнародны праект «Сацыяльная падтрымка людзям, якія выжылі ў спаленых беларускіх вёсках», які ў межах праграмы германскага фонду «Памяць, адказнасць і будучыня» ажыццяўляецца Беларускім фондам міра і Нацыянальным архівам, распачаўся ў кастрычніку. А ўжо каля 1,2 тысячы беларусаў атрымала матэрыяльную дапамогу ад берлінскага дабрачыннага аб'яднання «Кантакты». Але самае галоўнае, што кожны з тых, хто толькі цудам не трапіў у вогнішча фашысцкай расправы, прачытаў ліст, у якім сучаснае пакаленне немцаў просіць прабачэння за тое, што больш як 70 гадоў таму ўчынілі на нашай зямлі іх продкі.**



Фота Надзеі БУЖАН.

Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ і Наталля КІРЫЛАВА прыйшлі ў рэдакцыю «Звязды», каб расказаць пра новы праект.

Упершыню ўвага гэтай катэгорыі людзей, якія пацярпелі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, была ўдзелена падчас праекта «Павышэнне статусу вратаваных жыхароў спаленых беларускіх вёсак». Каб не ініцыятыва міжнароднага грамадскага аб'яднання «Узаемаразуменне», падтрыманая немцамі, то і дагэтуль пра гэты бок фашысцкага тэрору ведалі б толькі беларусы.

— Больш як 9 тысяч знішчаных вёсак на тэрыторыі адной краіны — беспрэцэдэнтны факт у сусветнай гісторыі, — пераканана **каардынатар праекта «Сацыяльная падтрымка людзям, якія выжылі ў спаленых беларускіх вёсках» Наталля КІРЫЛАВА.** — Тым не менш увесь свет ведае аб лёсе чэшскай Лідзіцэ, французскага пасёлка Арадур-сюр-Глан. Ёсць сёстры Хатыні ў Італіі, Грэцыі. Трагедыя аднаго населенага пункта — і ўвесь свет смуткуе. А пра лёс вялікай колькасці беларускіх вёсак, якія ў большасці сваёй былі знішчаны разам з людзьмі, мала хто ведае.

Але так было да апошняга часу. У выніку чатырохгадовай працы ў межах папярэдняга праекта Беларускі фонд міру дамогся таго, што нямецкая грамадскасць ды ўвогуле сусветная супольнасць прызнала гэтую катэгорыю ахвяр. Для жыхароў сучаснай Германіі трагедыя беларускіх вёсак у гады Вялікай Айчыннай вайны стала жудасным адкрыццём. Невыпадкова аказанне маральнай і матэрыяльнай дапамогі забытым ахвярам нацызму для многіх з іх — справа гонару.

Вядома, няма такіх грошай, якімі можна вымераць пакуты, што больш як 70 гадоў таму перанёс беларускі народ. Самае важнае для людзей, якія цудам выжылі ў спаленых вёсках, што пра іх успомнілі.

— Усе гэтыя прыкладна 9 тысяч чалавек з'яўляюцца пажылымі людзьмі, многія з іх вядуць замкнёны лад жыцця, — расказвае Наталля Кірылава. — Да нядаўняга часу ім нават не было каму расказаць пра той перажыты боль, які за многія гады яны назапасілі ў сабе. І калі ахвяры спаленых вёсак збіраюцца разам або сустракаюцца з моладдзю, адчуваецца, — яны ўдзячныя нават за тое, што ім далі магчымасць выказацца, што яны таксама датычныя да трагічнай гісторыі Беларусі.

Для гэтых людзей, многія з якіх выходзяць бадай толькі ў краму ці паліклініку, арганізоўвалася экскурсія па знакавых мясцінах краіны. Яны наведваюць музеі і тэатры, ходзяць у цырк, а таксама робяць свой унёсак у захаванне гістарычнай праўды. Менавіта ў тым ліку дзякуючы ўспамінам гэтых людзей Нацыянальным архівам Беларусі была створана электронная база «Беларускія вёскі, знішчаныя ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941—1944 гг.».

— На дадзены момант у ёй значыцца 9085 вёсак, але гэтая лічба не канчатковая, — гаворыць **вядучы архівіст Нацыянальнага архіва Беларусі Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ.** — Самая галоўная задача, якая сёння стаіць перад намі, — высветліць дакладную колькасць знішчаных вёсак. Толькі гэта вельмі складаная праца, і сіламі аднаго архіва яе зрабіць немагчыма. Нам патрэбна падтрымка краязнаўцаў, гісторыкаў, студэнтаў, якія б маглі на месцах удакладніць звесткі аб спаленых вёсках.

Больш-менш дакладная карціна мінулых падзей вядома па трох раёнах Беларусі: Смалявіцкім, Лагойскім і Верхнядзвінскім. А ўсё таму, што там працуюць энтузіясты, неабыякавыя да сваёй гісторыі людзі. Праўда, ёсць і адваротныя сітуацыі. Даходзіць нават да таго, што на месцы спаленай вёскі стаіць помнік, але яна не значыцца ні ў раённай кнізе «Памяць», ні ў іншых крыніцах. Прычым інфармацыя адсутнічае і па тых вёсках, якія ўвекавечаны ў Хатыні. Таму застаецца спадзявацца не толькі на памяць жыхароў спаленых вёсак, якім пашчасціла выжыць, а і на плённы саюз архівістаў, гісторыкаў і краязнаўцаў.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ На кантролі

# ПАЛЯЎНІЧЫЯ НА КАЎПАКІ

**Дэкаратыўныя аўтамабільныя каўпакі сталі масава знікаць з аўтамабіляў у Гомелі леташняй восенню. Серыя крадзяжоў з адным почыркам не засталася без увагі праваахоўнікаў. Як расказаў афіцыйны прадстаўнік УУС аблвыканкама Ігар ГРЫШКЕВІЧ, злодзеяў нарэшце затрымалі і размясцілі разважаць над сваімі ўчынкамі пад вартай.**



Высветлілася, што маладыя людзі аддавалі перавагу фірмовым каўпакам і нават прымалі замовы ў іншых на пэўную марку. Невядомыя спачатку «працавалі» ва ўсіх раёнах абласнога цэнтра, а потым і ў Рэчыцы.

У поле зроку аператыўнікаў трапілі маладыя людзі, якія прапанавалі набыць хоць і былыя ва ўжыванні, але фірменныя каўпакі за вельмі ўмераны кошт. 28-гадовы жыхар аграгарадка Чырвонае завёў сабе старонку на вядомай інтэрнэт-пляцоўцы, дзе выклаў фатаграфіі. За камплект фірменных каўпакоў прасіў усяго 60 рублёў. Прапанова карысталася ажыятажным попытам.

Пасля чарговага продажу крадзеных каўпакоў супрацоўнікі атрада міліцыі спецыяльнага прызначэння затрымалі аднаго са злодзеяў. Потым пры аглядзе гаража ў яго было канфіскавана амаль 50 камплектаў каўпакоў ад розных аўтамабіляў. Хутка затрымалі і 24-гадовага сябра па крымінальнай справе.

Высветлілася, што старэйшы таварыш, ахоўнік аднаго з сельгаспрадпрыемстваў, вырашыў сам падзарабіць, а потым прыцягнуў да крымінальнага «бізнесу» і малодшага знаёмага. Калі ў руках з'явіліся грошы, апетыты зладзюжак рэзка ўзраслі. Аднойчы ім патэлефанаваў мужчына і спытаў, ці няма ў наяўнасці каўпакоў на «Мерседэс» вызначанай маркі. Прадаўцы паабяцалі, што пашукаюць. І хутка знайшлі — на чужой машыне.

Следчыя Гомельскага гарадского аддзела СК мяркуюць, што ў міліцыю звярнуліся не ўсе пацярпелыя. Каўпакі ад машын, дарэчы, іх чакаюць.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

Организатор аукциона – Лельчицкий районный исполнительный комитет.

Предмет аукциона – право заключения договора аренды на земельный участок, площадью 0,0204 га с кадастровым номером 322855100002002483, расположенный по адресу: Гомельская область, г.п. Лельчицы, ул. Садовая. Имеются ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранных зонах объектов инженерной инфраструктуры (линии связи и радиофикации, сетей и сооружений водоснабжения, теплоснабжения, объектов газораспределительной системы) на площади 0,0160 га.

Целевое назначение использования земельного участка – для строительства и обслуживания здания ателье с магазином (земельный участок для размещения объектов бытового обслуживания населения). Срок аренды земельного участка 25 (двадцать пять) лет.

Начальная цена продажи 961,32 (девятьсот шестьдесят один рубль тридцать две копейки).

Сумма задатка 96,13 (девяносто шесть рублей тринадцать копеек).

Размер шага аукциона составляет 10% от предыдущей цены, названной аукционистом.

Условия продажи:

- внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка;
- возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка;
- заключение победителем аукциона с Лельчицким районным исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и осуществления в установленном порядке государственной регистрации права на земельный участок;
- разработка и утверждение в установленном порядке проектно-сметной документации на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;
- снятие, сохранение и использование плодородного слоя почвы согласно строительному проекту;
- освоение земельного участка в срок до шести месяцев после разработки и утверждения проектно-сметной документации;
- осуществление строительства на условиях и в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

1. Аукцион состоится 1 марта 2017 г. в $10^{00}$ в здании Лельчицкого районного исполнительного комитета, каб. 111 по адресу: г.п. Лельчицы, ул. Советская, 42.

2. Для участия в аукционе приглашаются индивидуальные предприниматели и юридические лица, подписавшие соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона на право заключения договора аренды земельного участка.

Для участия в аукционе необходимо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) подать в землеустроительную службу райисполкома в установленный в настоящем извещении срок заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который предполагается получить в аренду по результатам аукциона.

3. ***Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с*** $8^{30}$ ***до*** $17^{30}$***, последний день приема документов – до*** $17^{30}$ ***24 февраля 2017 года по адресу: г.п. Лельчицы, ул. Советская, 42. Заключительная регистрация участников 1 марта 2017 г. с*** $9^{00}$ ***до*** $9^{45}$***.***

4. ***Сумма задатка перечисляется на счет №3641421000035, в ЦБУ №315 г.п. Лельчицы филиала №300 ГУО ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, МФО 151501661, УНП 400032854, получатель – Лельчицкий районный исполнительный комитет.***

5. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

6. Организатор открытого аукциона вправе отказаться от аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до проведения аукциона.

За дополнительной информацией обращаться в Лельчицкий районный исполнительный комитет (землеустроительная служба), контактные телефоны в г.п. Лельчицы: 8 (02356) 5-02-51, 5-08-33

## Извещение о проведении 15 февраля 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минскремстрой»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)

| № | Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов | Местонахождение предмета торгов | Начальная цена предмета торгов с учетом НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | административное помещение с инвентарным номером 500/D-708150242, общая площадь 2008,7 кв. м; теплосети (инв. №01-178); электросети (инв. №01-169); сети водопровода (инв. №01-170) | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 27 | 1 159 748,32 | 100 000,00 |
| 2 | административное помещение с инвентарным номером 500/D-708150241, общая площадь 11,7 кв. м | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 26 | 23 582,33 | 2 300,00 |

**Продавец имущества:** ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220050, г.Минск.

**Организатор торгов:** коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул.К.Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов**: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет коммунального унитарного предприятия «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 по г.Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г.Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся 15 февраля 2017 года в 11.00 по адресу: г.Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 06.02.2017 по 13.02.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017)327-48-36 (коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости»);
(017)200-99-78, (029)350-46-23
(ОАО «Минскремстрой»).

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

**извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Агат-электромеханический завод»**

| | | Начальная цена продажи, доллары США (в т.ч. НДС 20%) | Задаток (5% от начальной цены), доллары США | Шаг аукциона,% |
|---|---|---|---|---|
| **Лот №1** | 1. Здание монтажного корпуса №10 с инв. №500/С-9387. Общая площадь – 8 318 кв. м. Г.п. – 1955. Этажей – 1-2. Составные части и принадлежности: основное строение – литер Г1-2/к, холодная пристройка – литер 1. Примечания: Литер Г1-2/к, этажность 1-2 Адрес: г. Минск, ул. Волгоградская, 6. 2. Административное помещение с инв. №500/D-707951888. Назначение: административное помещение. Общая площадь – 4390,4 кв. м. Помещение расположено в подвальном, на 1, 2, 3-м этажах. Адрес: г. Минск, ул. Волгоградская, 6-1 | 5 674 609,20 | 283 730,46 | 5 |

ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК

1. Здание с инв. №500/С-9387 расположено на земельном участке площадью 1,3615 га с кадастровым номером 500000000009005428. Целевое назначение – эксплуатация и обслуживание здания неустановленного назначения. Право аренды по 31.01.2023. Описание права, ограничения (обременения) прав – ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные: в охранных зонах линий связи и радиофикации (0,1292 га); в охранных зонах линий электропередачи (0,1292 га); в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения (0,1292 га); в охранных зонах сетей и сооружений канализации (0,1292 га). Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
2. Право пользования земельным участком для обслуживания административного помещения с инв. №500/D-707951888 будет определено в соответствии с законодательством Республики Беларусь после подписания договора купли продажи

ОБРЕМЕНЕНИЯ

1. Часть здания монтажного корпуса №10 с инв.№500/С-9387 сдается по договору аренды от 12.01.2016 №356 до 31.03.2017 (площадь, сдаваемая в аренду 5 539,2 кв. м). Часть здания монтажного корпуса №10 с инв. №500/С-9387 сдается по договору аренды №44/382 на срок до 29.12.2017 г. (площадь сдаваема в аренду 306,4 кв. м).
В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 23.04.2003 №165 «Об утверждении генерального плана г. Минска с прилегающими территориями и некоторых вопросах его реализации» в границах пр. Независимости – ул. Волгоградская – ул. Кутузова – ул. Б.Слепня – ул. Кедышко – ул. Филимонова, территория электромеханического завода предназначается под жилую многоквартирную застройку.
2. Административное помещение с инв. №500/D-707951888 – Договор аренды от 13.08.2013 №314 заключен по 12.08.2018 с СООО «МТС» для размещения антенн и оборудования систем сотовой связи

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот №1 по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Лота №1 в течение 20 (двадцати) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона.

В случае продажи Лота №1 денежные средства перечисляются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) в следующем порядке:

